ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 104 (2053)
28 снежня 1965 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ і ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

24 снежня 1965 года адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

Пленум заслухаў і абмеркаваў даклад сакратара ЦК КПБ тав. Ф. А. Сурганава «Аб ходзе выканання рашэнняў сакавіцкага (1965 г.) Пленума ЦК КПСС і задачах на 1966 сельскагаспадарчы год».

У спрэчках выступілі: т. т. І. Я. Палякоў—першы сакратар Мінскага абкома КПБ, У. А. Мікуліч — першы сакратар Брэсцкага абкома КПБ, А. Д. Гурбан — сакратар Добрушскага райкома КПБ, Г. І. Коцяш — начальнік упраўлення Беларускай чыгункі, В. Ф. Языковіч — першы сакратар Гомельскага абкома КПБ, Л. І. Хітрун — старшыня рэспубліканскага аб'яднання «Белсельгастэхніка», У. А. Баум — старшыня калгаса імя XXII з'езда КПСС Іўеўскага раёна, А. В. Аляксанкін — міністр меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР, С. Г. Скарапанаў — міністр сельскай гаспадаркі БССР, П. Я. Рубіс — старшыня выканкома Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных, І. М. Кадзетаў — сакратар Столінскага райкома КПБ, М. П. Малочка — старшыня выканкома Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных, В. В. Прышчэпчык — сакратар Магілёўскага абкома КПБ, А. К. Вяржбіцкая — дырэктар саўгаса «Стара-Барысаў» Барысаўскага раёна.

На пленуме з прамовай выступіў першы сакратар ЦК КП Беларусі тав. П. М. Машэраў.

Па абмеркаванаму пытанню пленум прыняў пастанову.

Пленум вызваліў ад абавязкаў члена Прэзідыума ЦК КПБ і сакратара ЦК КПБ тав. В. Ф. Шауру ў сувязі з пераходам на іншую работу.

Пленум выбраў членам Прэзідыума ЦК КПБ і сакратаром ЦК КПБ тав. С. А. Пілатовіча.

У сувязі з рэарганізацыяй Камітэта партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР у Камітэт народнага кантролю БССР пленум вызваліў старшыню Камітэта народнага кантролю БССР тав. А. А. Смірнова ад абавязкаў сакратара ЦК КПБ.

ЮБІЛЕЙ БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁ І ТЭЛЕБАЧАННЯ

24 снежня ў Мінску адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны 40-годдзю Беларускага радыё і 10-годдзю тэлебачання.

У прэзідыуме сходу — сакратары ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэраў, С. О. Прытыцкі, С. А. Пілатовіч, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР І. Ф. Клімаў, міністр сувязі БССР П. В. Афанасьеў, міністр культуры БССР М. А. Мінковіч, намеснік старшыні Камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачанні пры Савеце Міністраў СССР Л. С. Максакаў, акадэмік АН БССР К. І. Лукашоў, пісьменнік І. П. Шамякін, рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна А. Н. Сеўчанка, намеснік міністра замежных спраў БССР А. Е. Гурыновіч, дэлегацыі работнікаў Украінскага, Літоўскага, Латвійскага, Эстонскага, Малдаўскага, Ленінградскага радыё і тэлебачання, рэдактары рэспубліканскіх газет і часопісаў і няштатныя карэспандэнты, работнікі Беларускага радыё і тэлебачання, наватары вытворчасці.

Сход адкрыў сакратар Мінскага гаркома КПБ В. Я. Лежапёкаў.

Сакратар ЦК КПБ С. О. Прытыцкі зачытаў сустрэтае апладысментамі прывітанне Цэнтральнага Камітэта КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і Савета Міністраў БССР юбілярам.

З дакладам аб 40-годдзі Беларускага радыёвяшчання і 10-годдзі Беларускага тэлебачання выступіў старшыня Камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачанні пры Савеце Міністраў БССР В. П. Палескі.

□

У сувязі з 40-годдзем Беларускага радыё і 10-годдзем тэлебачання Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Ганаровымі граматамі і Граматамі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР узнагароджана вялікая група работнікаў і няштатных карэспандэнтаў радыё і тэлебачання.

За высокі ўзровень літаратурнага і мастацкага выканання радыёперадач дыктару Л. Я. Стасевіч прысвоена ганаровае званне заслужанай артысткі Беларускай ССР.

Дарогай пошукаў

ЗАВОЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РАБОТНІКАЎ КУЛЬТАСВЕТУСТАНОЎ

М. ШАЎЧУК,
начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення культуры

КУЛЬТАРМЕЕЦ—ЧАЛАВЕК БАГАТЫХ ВЕДАЎ

Калегія Міністэрства культуры БССР, распрацоўваючы мерапрыемствы па паляпшэнню дзейнасці культасветустаноў у час падрыхтоўкі да XXIII з'езда КПСС, рэкамендавала газеце «Літаратура і мастацтва» правесці завочную канферэнцыю работнікаў устаноў культуры рэспублікі. Тэма размовы — усё новае, перадавое, што накапілася ў культурным абслугоўванні працоўных, у рабоце клубаў, бібліятэк, музеяў, калектываў мастацкай самадзейнасці, універсітэтаў культуры.

Артыкулам намесніка міністра культуры БССР Р. Мачуліна «Ісці дарогай пошукаў», надрукаваным 21 снежня г. г., рэдакцыя пачала канферэнцыю. Сёння працягвае размову начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення культуры М. Шаўчук.

Запрашаем работнікаў культасветустаноў прыняць у завочнай канферэнцыі самы актыўны ўдзел.

АДКРЫЦЦЁ клуба — заўсёды радасная падзея ў калгасе.

Але вось адшумела гэтае свята. Выступілі колькі раз на новай сцэне самадзейныя артысты раёна, прафесіяналы з абласнога цэнтра і нават, здараецца, сталіцы, а праз месяц, другі — пісьмо або званок старшыні калгаса:

— Клуб які пабудавалі! Люба глянуць... Просім накіраваць да нас добрага, ініцыятыўнага работніка. Наш загадчык клуба ад работы адмовіўся.

Такое, на жаль, бывае часта. Стаіць у вёсцы прыгожы палац культуры, а радасці ён не нясе людзям.

Чаму ж многія клубныя работнікі імённа ў такіх храмах культуры не хочуць працаваць, самі пакідаюць іх? У невялічкім пакоі або хаце не так відна была іх бездапаможнасць, а пабудавалі палац — і адразу ўсе недахопы кінуліся ў вочы. Ды раней і апраўдацца можна было лёгка: у нас, маўляў, няўтульна, холадна, таму да нас ніхто не ідзе. Цяпер і гэты козыр з рук выпаў.

Ціматлівыя просьбы старшынь калгасаў — паслаць у сельскі клуб добрага работніка, — у большасці сваёй застаюцца незадаволеныя. У раён мы штогод пасылаем не больш двух-трох выпускнікоў культасветвучылішчаў. Многія з іх, папрацаваўшы год, а то і менш, пакідаюць работу.

І атрымліваецца, што ў клуб ідзе працаваць не той, у каго ёсць здольнасці, спецыяльная адукацыя, а той, каму трэба зачаніцца абы дзе. Сярод нашых работнікаў культуры ёсць многа і такіх, якія часова загадваюць клубам год — два, каб за гэты тэрмін падрыхтавацца і паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову. Такі «дзеяч» ад культуры не хварэе душою за работу, і паяўляюцца ў дзённіку запісы анекдатычнага зместу: «калектыўнае чытанне газеты», праз дзень: «калектыўнае чытанне часопіса», а праз тыдзень: «калектыўнае чытанне кнігі...»

Думаючы над тым, як выканаць пастанову Вярхоўнага Савета БССР «Аб стане і мерах паляпшэння работы культурна-асветных устаноў рэспублікі», прыходзіш да высновы, што падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў для культасветустаноў — сёння праблема нумар адзін.

Разумеем, што на працягу аднаго — двух гадоў мы ніколі не атрымаем у дастатковай колькасці выпускнікоў з навучальных устаноў. Калі не павялічацца прыёмы ў музычныя і культасветвучылішчы, бібліятэчныя тэхнікумы і інстытуты, дык добры дзесятак гадоў нам давядзецца, відаць, і далей штогод накіроўваць у раёны па два—тры спецыялісты.

Ненармальна і тое, што навучальныя ўстановы культуры падпарадкаваны не Міністэрству культуры, а Міністэрству вышэйшай, спецыяльнай сярэдняй і прафесіянальнай адукацыі, дзе яны не карыстаюцца дастатковай увагай. Сказаць хоць бы, што за апошнія гады ніхто з міністэрства, якое адказвае за работу навучальных устаноў культуры, не зацікавіўся, як працуюць іх выпускнікі. Міністэрства не падтрымлівае сувязі з органамі культуры на месцах, не цікавіцца вопытам устаноў культуры, дзе працуюць маладыя спецыялісты.

Нам здаецца, што, не чакаючы вырашэння пытання аб павелічэнні выпуску спецыялістаў у галіне культуры, паляпшэнні іх падрыхтоўкі, неабходна смялей брацца за павышэнне кваліфікацыі культасветработнікаў, якія сёння працуюць і маюць здольнасці да культмасавай работы.

Нядаўна бюро Брэсцкага абкома партыі разгледзела нашы мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне работы з кадрамі культасветработнікаў, і ўхваліла іх.

Вырашана стварыць абласны інстытут павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры. Трэба адразу агаварыцца, што ўся яго работа будзе арганізавана на грамадскіх асновах, за выключэннем аплаты выкладчыкаў, запрошаных з іншых ведамстваў.

Інстытут ставіць перад сабой задачу — павысіць кваліфікацыю работнікаў культуры, вывучаць, абагульняць і распаўсюджваць перадавы вопыт, аказваць метадычную дапамогу ўстановам культуры. Інстытутам кіруе савет, у склад якога ўвайшлі найбольш актыўныя работнікі культуры вобласці. Зацверджаны план яго работы на 1965—66 гады. За гэты час на месячных курсах будзе займацца 240 клубных і бібліятэчных работнікаў. Гэта перш за ўсё тыя, хто мае агульную сярэднюю адукацыю і некаторы вопыт работы. Створана восем груп па 30 чалавек у кожнай. Групы камплектуюцца дыферэнцыявана, улічваецца стаж работы і адукацыя загадчыка клуба ці бібліятэкара.

Ужо скончыла месячныя курсы 90 клубных і бібліятэчных работнікаў. Усе яны лічаць, што курсы далі ім многа новага.

У клубах нашай вобласці вельмі мала масавікоў-забаўнікаў, якія ўмелі б цікава арганізаваць адпачынак працоўных. Таму ў многіх клубах сумна, а маладзёжныя вечары — гэта ўсё тыя ж танцы.

Мы стварылі вочна-завочную школу масавікоў-забаўнікаў, у якую залічана 50 чалавек. Кожны квартал яе слухачы прыязджаюць у абласны цэнтр на трохдзённы практыкум. З імі займаюцца лепшыя масавікі паркаў культуры і адпачынку, дамоў культуры вобласці. Запрашаем спецыялістаў і з Мінска.

Праграма семінара-практыкума складзена такім чынам, што больш увагі аддаецца практычным заняткам — вывучэнню гульняў і г. д. Пасля першых заняткаў кожны слухач атрымлівае пэўнае заданне, якое павінен падрыхтаваць да наступнай сустрэчы ў вобласці. Маем на ўвазе, што на чарговых семінарах-практыкумах выступяць масавікі з Ленінграда, Масквы, якіх мы запрасілі ў Брэст.

У сістэме інстытута пачала працаваць двухгадовая вочна-завочная школа мастакоў-афарміцеляў. Яе рабоце абком партыі аддае асаблівую ўвагу, бо з наглядной агітацыяй на вёсцы сапраўды не ўсё добра. У школу, залічана 60 мастакоў-афарміцеляў, зацверджана праграма і вучэбны план. Маецца на ўвазе, што яе слухачы ў раёнах стануць пастаяннымі кансультантамі пры афармленні сельскіх клубных устаноў і чырвоных куткоў.

Слухачы школы кожны квартал збіраюцца на пяцідзённыя семінары. Пад кіраўніцтвам вопытных мастакоў яны выконваюць канкрэтныя заданні, атрымліваюць парады. Напрыклад, першыя заняткі былі прысвечаны афармленню наглядной агітацыі насустрач XXIII з'езду КПСС і 50-годдзю Савецкай улады. Удзельнікі семінара пабывалі ў сельскіх клубах, на прамысловых прадпрыемствах, пазнаёміліся з лепшымі ўзорамі наглядной агітацыі.

Створан пастаянны семінар па вывучэнню і ўкараненню новых абрадаў, традыцый і звычаяў. Яго слухачы таксама штоквартальна збіраюцца на тры дні. На першым семінары апрача лекцый яны ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы і правядзенні ўрачыстай рэгістрацыі нованароджаных у Кобрынскім раённым Доме культуры, прысутнічалі на вечары пасвячэння ў рабочыя. Спадзяёмся, што слухачы гэтага семінара (а іх 30 чалавек), у сваіх раёнах стануць прапагандыстамі новых абрадаў і звычаяў.

Пачалі працаваць пастаянныя трохдзённыя семінары кіруючых раённых работнікаў культуры — загадчыкі і інспектары раённых аддзелаў, дырэктары і мастацкія кіраўнікі РДК, загадчыкі раённых бібліятэк. Цікава прайшоў, напрыклад, семінар загадчыкаў аддзелаў культуры ў Пружанскім раёне, яго ўдзельнікі пазнаёміліся з работай мясцовага аддзела культуры і лепшых яго ўстаноў.

У студзені на чарговым семінары, які мяркуем правесці ў Століне, загадчыкі аддзелаў будуць вывучаць стыль работы Столінскага раённага аддзела культуры.

Семінар дырэктараў раённых і гарадскіх дамоў культуры ў студзені адбудзецца ў Шарашоўскім Доме культуры і Кобрынскім РДК. Вядома, што работа многіх дамоў культуры былых раённых цэнтраў значна аслабла, а сям-там і зусім занядбана. Гэтага нельга сказаць пра Шарашова, таму тут і вырашана правесці семінар.

Работнік культуры, калі ён хоча добра працаваць, абавязаны штодзень вучыцца, чытаць. Нас зацікавіла, а як працуюць клубныя і бібліятэчныя работнікі, якія маюць спецыяльную адукацыю. І што ж высветлілася? Многія з іх, даўно закончыўшы навучальныя ўстановы (часцей за ўсё завочна), разгубілі свае веды, рэдка чытаюць спецыяльную і мастацкую літаратуру.

У нашым інстытуце і для іх мы знайшлі дзейсную форму вучобы, Арганізаваны вочна-завочны аднагадовы семінар павышэння кваліфікацыі. На клубнае і бібліятэчнае аддзяленне залічана 140 чалавек. Кіраваць семінарам будуць кансультанты — работнікі абласных устаноў і ўпраўлення культуры. За кожным замацавана па шэсць — восем чалавек. Слухач семінара на працягу года павінен выканаць чатыры кантрольныя работы, тэмы якіх зацверджаны саветам інстытута.

Тэмы кантрольных работ адлюстроўваюць пытанні тэорыі і практыкі культасветработы. Кантрольная работа высылаецца кансультанту, які рэцэнзуе яе і свае водгукі высылае слухачу. Нам здаецца, што гэта форма вучобы прымусіць слухачоў займацца самаадукацыяй, чытаць спецыяльную і мастацкую літаратуры, перыядычны друк, сачыць за новым у рабоце. Лепшыя кантрольныя работы, якія цікава раскажуць пра вопыт правядзення асобных масавых мерапрыемстваў у клубе і бібліятэцы, мы разашлём ва ўсе культасветустановы вобласці.

Апроч таго, кожны слухач атрымае 50—70 пытанняў па ўсіх раздзелах клубнай і бібліятэчнай работы для пяцідзённых семінарскіх заняткаў, якія будуць праводзіцца ў Брэсце раз у паўгода.

Важны ўчастак клубнай работы — мастацкая самадзейнасць. А як быць з кіраўнікамі калектываў? Гэта, бадай, найбольш вострае пытанне. На працягу многіх год мы рыхтуем гэтых спецыялістаў на дзесяцімесячных курсах пры абласным Доме народнай творчасці. За апошнія восем гадоў на такіх курсах у вобласці і Мінску падрыхтавана больш 600 чалавек. Гэта нямала. Але, аказваецца, што цяпер у клубных установах працуе крыху больш за сто выпускнікоў курсаў. Дзе ж астатнія? Цяжка сказаць. Некаторыя пакінулі работу або зусім выехалі. Нам здаецца, што многія выпускнікі курсаў, не атрымаўшы дастатковых ведаў і практычных навыкаў, пакінулі работу таму, што не захацелі быць, калі можна так сказаць, дрэннымі кіраўнікамі самадзейных гурткоў.

Сапраўды, цяжка за дзесяць месяцаў падрыхтаваць дырыжора ці баяніста. На выпускных экзаменах, на якіх мы прысутнічалі ў баяністаў, давялося чуць вельмі пасрэднае выкананне некалькіх просценькіх твораў з праграмы трэцяга—чацвёртага класаў музычнай школы. А калі папрасілі найграць любы матыў сучаснай савецкай песні, сыграць любы бытавы танец, які баяністу давядзецца ўсё-такі іграць на вечары ў клубе, адказ быў адзін: «Нас гэтаму не вучылі».

За дзесяць месяцаў курсант у лепшым выпадку атрымае навыкі самастойнай работы з інструментам, навучыцца ледзь-ледзь разбіраць ноты.

Мы ўлічылі гэтую акалічнасць, і цяпер на курсы баяністаў прымаем толькі тых, хто ўжо трошкі валодае інструментам, мае некаторыя практычныя навыкі.

У нашым інстытуце арганізавана двухгадовая вочна-завочная школа для выпускнікоў дзесяцімесячных абласных і рэспубліканскіх курсаў мінулых гадоў. У ёй вучацца сто чалавек: 50 баяністаў, 20 харавікоў-дырыжораў, 20 кіраўнікоў танцавальных і 10 кіраўнікоў драматычных калектываў. За кожным замацоўваецца выкладчык музычнага вучылішча, музычных школ Брэста, Пінска, Баранавіч або артыст абласнога тэатра. Тры разы ў год слухачоў выклікаюць на сямідзённыя заняткі. У час паміж семінарамі слухачы выконваюць заданні, яны ў любы момант могуць прыехаць да свайго педагога і атрымаць кансультацыю.

Для кіраўнікоў драматычных калектываў створаны пастаянны кансультацыйны пункт пры Абласным драматычным тэатры імя ЛКСМБ. Кіраўнікі танцавальных калектываў будуць праходзіць семінары на базе народнага маладзёжнага ансамбля «Радасць».

(Заканчэнне на 4-й стар.).

25 снежня ў Мінску закрыўся аптовы кніжны кірмаш. У ім удзельнічала каля 50 кнігагандлёвых арганізацый краіны. Шырока прадстаўлена была літаратура выдавецтваў Беларусі. Паміж кнігагандлёвымі арганізацыямі заключаны здзелкі больш чым на мільён рублёў.

У час кірмашу кнігагандлёвыя работнікі сустракаліся з беларускімі пісьменнікамі і паэтамі, дырэктарамі і рэдактарамі выдавецтваў.

На здымку — (злева направа) таваразнаўца аддзела кніжнага гандлю Горкаўскага абспажыўсаюза Г. Скорнін, таваразнаўца Прылукскага райспажыўсаюза А. Марфін і старшы таваразнаўца Гродзенскай універсальнай базы А. Васількова афармляюць гандлёвыя пагадненні на 1966 год.

Фота І. ЗМІТРОВІЧА. (БЕЛТА).

У ТЭАТРАХ І НА ЭСТРАДАХ

У навагодні вечар і першы дзень новага года тэатральныя і эстрадныя калектывы рэспублікі пакажуць гледачам свае лепшыя спектаклі і святочныя канцэрты.

У Акадэмічным тэатры Я. Купалы будзе ісці «Паўлінка». Дзяржаўны тэатр імя Я. Коласа пакажа спектакль па п'есе «Чатыры крыжы» А. Дзялендзіка. А маладыя артысты тэатра падрыхтавалі для маленькіх гледачоў пастаноўку «Беласнежка і сем гномаў». Днямі адбудзецца прэм'ера. Калектыў Тэатра імя М. Горкага прапануе спектакль «Куды ідзеш, Сяргей!» па п'есе А. Маўзона. Навагоднія балі з удзелам артыстаў адбудуцца ў Тэатры оперы і балета, а таксама ў Гродзенскім абласным драматычным тэатры. Запрашаюць на навагоднія спектаклі артысты Магілёўскага, Гомельскага, Брэсцкага тэатраў.

Брыгады артыстаў Беларускай дзяржаўнай філармоніі выступяць у Гомелі, Бабруйску, Мазыры, Брэсце, Пухавічах, Баранавічах. Дзве брыгады дадуць навагодняя канцэрты для гледачоў Каўнаса і Архангельска.

Шэфскія спектаклі і канцэрты адбудуцца ў салдацкіх клубах і дамах афіцэраў Беларускай ваеннай акругі.

ВІЦЕБСКАЯ «ВЯСЁЛКА»

«Вясёлка» — гарадскі маладзёжны клуб, які пачаў працаваць у Віцебску. Яго стварылі гарадскі камітэт камсамола, аддзяленне таварыства «Веды» і праўленне Палаца культуры мясцовай прамысловасці. У адкрыцці клуба прынялі ўдзел паэты і архітэктары, музыканты і спартсмены. Першы ўзяў слова студэнт педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава І. Барадзей. З цікавасцю слухала моладзь расказ аб Алжыры, дзе І. Барадзей у складзе савецкай дэлегацыі правёў некалькі месяцаў. Аб паездцы ў Алжыр віцебскі студэнт зняў дакументальны фільм, зрабіў замалёўкі.

Якімі будуць плошчы нашага горада? На гэтае пытанне адказала галоўны архітэктар аблпраекта А. Данілава. Цікавай была літаратурна-музычная старонка вечара. З чытаннем новых вершаў выступіў паэт Д. Сімановіч. Малады кампазітар А. Гоман выканаў свае песні.

ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ МУЗЫКАНТАЎ

На працягу многіх год на Маладзечанскую фабрыку музычных інструментаў прыходзяць пісьмы ад працоўных з адным і тым жа пытаннем: дзе набыць акардэон ці баян для дзіцяці?

Гэтыя інструменты ў нашай рэспубліцы не вырабляюцца. А дасылаюць іх у Беларусь у вельмі малой колькасці. Дырэктар фабрыкі П. Смірноў паведаміў:

— Тры дні назад на фабрыцы зроблены новыя два ўзоры музычных інструментаў — акардэона і баяна. Яны прызначаны для дзяцей ад 4 да 10 год. Афармленне інструментаў будзе прывабным і спадзяемся, што яно спадабаецца пакупнікам. Выраб акардэонаў і баянаў пачнецца неўзабаве.

МАСТАКІ—МОЛАДЗІ

Мастакі Гродзеншчыны выканалі апошнія заказы гэтага года. Людміла Налівайка закончыла роспіс сцен у кафэ «Рамантыкі», якое адкрываецца днямі ў Гродна. У музычна-педагагічным вучылішчы афармлены кабінеты харавога мастацтва і рускай музычнай літаратуры. Для школы-інтэрната і сельскагаспадарчага прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча ў Ашмянах выкананы навагоднія панно, плакаты, мантажы. У афармленчых работах прымалі ўдзел мастакі М. Плужнік, Д. Парахня, С. Сілуянаў, С. Огнеў і іншыя.

ПА-СУСЕДСКУ

Палац культуры завода «Гомсельмаш» і гарадское прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча № 6 — суседзі. Будучыя маладыя рабочыя ахвотна праводзяць свой вольны час у палацы, карыстаюцца яго бібліятэкай. Для навучэнцаў вучылішча арганізаваны універсітэт музычнай культуры. Першая лекцыя была прысвечана тэме «Як слухаць і разумець музыку».

Работа універсітэта разлічана на ўвесь навучальны год. За гэты час навучэнцы вучылішча праслухаюць лекцыі «Народная музыка», «Беларуская музыка», «Музыка ў жыцці Ул. І. Леніна», «Савецкая песня і музыка кіно», пазнаёмяцца з творчасцю вядучых савецкіх кампазітараў.

Лекцыі будуць суправаджацца выступленнямі артыстаў Белдзяржфілармоніі.

В. СЯМЁНАЎ.

НА ШЫРОКІ ЭКРАН

Брыгада мантажнікаў мінскага завода «Кінадэталь» заканчвае ўстаноўку шырокафарматнай кінаапаратуры ў бабруйскім кінатэатры «Таварыш». Хутка тут пачнуць дэманстравацца шырокафарматныя фільмы.

НАСУСТРАЧ ВЯЛІКАЙ ДАЦЕ

ПРА НАШУ РАДЗІМУ

Гэтай кнігі пакуль яшчэ няма. Дзесяткі вучоных, географаў, гісторыкаў, эканамістаў яшчэ толькі рыхтуюць яе, каб пазнаёміць нашых сучаснікаў з тым, чым была наша краіна ў мінулым і чым стала ў нашы дні. Шматтомнае выданне яе прысвячаецца 50-годдзю Вялікага Кастрычніка і будзе выпушчана ў бліжэйшыя тры гады, як унікальнае даследаванне пра нашу Радзіму, пра разнастайныя кліматычныя і прыродныя багацці Савецкага Саюза. Паўтараю—гэтай кнігі пакуль што яшчэ няма, але мы бачылі ўжо эскізы яе супервокладак у выдавецтве «Мысль».

22-томнае выданне «Савецкі Саюз» расскажа пра ўсе 15 рэспублік Радзімы. Як паведаміў рэдактар выдавецтва Р. С. Міцін, ужо ў будучым, 1966 годзе выйдуць у свет першынцы гэтай вялікай працы. Першынцамі мы іх называем таму, што расказы пра Арменію, Беларусь, Эстонію, Латвію і Літву будуць першымі кнігамі пра прыроду, клімат, гаспадарку, эканамічныя багацці, пра гарады і сёлы нашай неабсяжнай краіны.

Беларусь займае асобны том. Яго рыхтавалі буйнейшыя беларускія вучоныя, географы, гісторыкі, эканамісты. Новае выданне зусім непадобнае на гісторыка-геаграфічныя кнігі, што выдаваліся раней і адрасаваліся вузкаму колу чытачоў—спецыялістам, якія займаліся вывучэннем таго або іншага пытання.

Чым жа цікавая гэтая новая кніга пра Беларусь?

Яна ў папулярнай форме пазнаёміць самыя шырокія колы чытачоў з гісторыяй нашай рэспублікі, з яе прыродными багаццямі, з гістарычнымі зменамі, што адбыліся пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Асобныя раздзелы прысвячаюцца фарміраванню новай, сацыялістычнай нацыянальнай культуры Беларусі, яе сувязям з культурай іншых народаў СССР. У кнізе асвятляюцца дасягненні навукі, адукацыі. Яшчэ ніколі ў адным кніжным выданні не было такіх падрабязных звестак пра прамысловасць, сельскую гаспадарку, транспарт рэспублікі.

Цікава, што ў выданні «Савецкі Саюз» Беларусь характарызуецца як рэспубліка з маладой хімічнай і нафтавай прамысловасцю.

Усе дасягненні становяцца асабліва прыкметнымі, бо ў кнізе прыведзены табліцы і схемы, якія паказваюць рост эканомікі рэспублікі за тры перыяды. Дадзены параўнальныя лічбы за 1913—1940—1965 гады. Гэтыя дадзеныя пакажуць чытачу, якіх поспехаў дабілася рэспубліка за гады Савецкай улады.

Чытач знойдзе ў гэтай кнізе звесткі, якія яго цікавяць. Той, хто любіць паляванне, рыбную лоўлю, напэўна, захоча паехаць у Прынямонне або ў Белавежскую пушчу. Кожны аматар беларускай прыроды знойдзе ў кнізе і геаграфічную карту і падрабязныя апісанні ўпадабаных ім мясцовасці, расліннага і жывёльнага свету.

Спецыяльны том выдання «Савецкі Саюз» прысвечаны апісанню краіны ў цэлым. Да рэвалюцыі геаграфічнае апісанне Расіі пад кіраўніцтвам вучонага-падарожніка Сямёнава-Цяньшанскага так і не было ажыццёўлена да канца. Цяпер апісанне Савецкага Саюза будзе дадзена поўнасцю і шырока. Яно адлюструе поспехі нашай Радзімы ў развіцці народнай гаспадаркі, навукі і культуры. Геаграфічнае апісанне Савецкага Саюза дапоўнена багатымі ілюстрацыямі і шматлікімі здымкамі. Гэта і надае новаму выданню святочнасць, яго з ахвотай набудзе кожны. Неўзабаве на кніжных паліцах магазінаў гарадоў і сёл Савецкага Саюза з'явяцца першыя тамы выдання «Савецкі Саюз».

А. ПЯТРОВА,
нар. «Літаратуры і мастацтва».
Масква.



Вось і яшчэ адзін асілак становіцца ў строй гігантаў індустрыі рэспублікі. Гэтымі днямі пачала працаваць першая чарга Другога Салігорскага калійнага камбіната. З яе цудоўнай панарамай прапануе нам пазнаёміцца фотакарэспандэнт БЕЛТА П. Маватараў.

Аматарамі песні славіцца віцебская абутковая фабрыка «Чырвоны «Кастрычнік». У харавым гуртку займаюцца многія маладыя рабочыя.

На гэтым здымку вы бачыце групу ўдзельнікаў фабрычнага хору, ударнікаў камуністычнай працы рантавага цэха Пашу Усачову і Леаніда Ангірскага, работніц Тамару Вінікаву і Ніну Радыёнаву. Яны развучваюць новую народную песню.

Фота С. АЛЯКСЕЕВА. (БЕЛТА).

ПРЫЙШОЎШЫ З ДЫПЛОМАМ У РЭДАКЦЫЮ...

Толькі што ў Маскве закончыў работу пленум праўлення Саюза журналістаў СССР. Сярод іншых важных пытанняў пленум абмеркаваў становішча з падрыхтоўкай журналістаў ва універсітэтах краіны.

Дзейнасць аддзяленняў і факультэтаў журналістыкі хвалюе шырокую журналісцкую грамадскасць. Яшчэ адно сведчанне гэтаму — актыўнае абмеркаванне чытачамі артыкула «Дыплом журналіста», змешчанага 19 лістапада г. г. у нашай газеце. Сёння мы друкуем яшчэ некалькі водгукаў на гэты артыкул.

Успамінаюцца гады студэнцтва. У нашых пакоях да позняй ночы ішлі шумныя спрэчкі пра будучую прафесію, гарачыя дыскусіі пра сістэму падрыхтоўкі журналістаў. Думкі выказваліся самыя супярэчлівыя:

— Навошта наведваць лекцыі? Будзем вучыцца самастойна.

— Каму патрэбны лекцыі па стараславянскай мове? Паслалі б лепш на практыку.

— Увесь год карпеем над гісторыяй мовы, а не можам без памылак напісаць дыктант.

Студэнты спрачаліся, гаварылі гарачыя прамовы, але вучэбныя планы не мяняліся. Выкладчыкі чыталі лекцыі, праводзілі практычныя заняткі, прымалі экзамены. Адны з маіх сяброў-аднакурснікаў праседжвалі штаны, як піша А. Белавусаў, над тоўстымі кнігамі, другія—абівалі парогі рэдакцый мінскіх газет, радыё і тэлебачання, трэція—не рабілі ні таго, ні другога.

І вось, нарэшце, мінула пяць гадоў. У кішэні—дыплом журналіста, на штрыфелі падношанага студэнцкага пінжака—універсітэцкі значок. У маладога спецыяліста—прыўзнята-бадзёры настрой.

«Нарэшце, — думае ён,—дачакаўся шчаслівага дня: не трэба хадзіць на лекцыі, карпець у бібліятэцы над падручнікамі, трэсціся перад дзвярыма аўдыторыі ў чаканні сустрэчы з экзаменатарам. Выпісваю камандзіроўку, кладзі ў кішэню блакнот і адпраўляйся ў дарогу. Вось яна, сапраўдная рамантыка журналісцкай прафесіі».

Але праходзяць дні, тыдні, месяцы, і пачынаеш разумець, што да сапраўднай журналістыкі табе яшчэ вельмі далёка. Ты заклапочана глядзіш на стомлены твар рэдактара, які без жалю крэсліць і крэмзае твой чарговы твор. «Перадрукаваць»,—піша, нарэшце, ён, прачытаўшы апошнюю старонку,. Потым знімае акуляры, дапытліва глядзіць на цябе і пачынае тлумачыць, чаму не атрымалася карэспандэнцыя. Аказваецца, ты не ведаеш многіх простых рэчаў. Рэдактар цярпліва расказвае аб сакрэтах хімічнай праполкі ільну, а потым, каб марна не траціць дарагі час, кажа:

— Вазьмі во лепш брашуру прачытай.

У наступны раз небяспека падпільноўвае цябе з другога боку— «зрэзаўся» на кармавых адзінках. Каб яшчэ раз не дэманстраваць сваё невуцтва, ідзеш да рэдактара: так і так, у сельскай гаспадарцы не разбіраюся, перавядзіце ў іншы аддзел. Рэдактар кладзе табе на плячо руку і па-сяброўску кажа:

— Навошта такія крайнасці? Толькі месяц папрацаваў у газеце і ўжо хочаш узяць бога за бараду. Не такая, мілы чалавек, лёгкая прафесія журналіста, як табе здаецца. Сёння спатыкнуўся—заўтра будзеш ісці смялей...

Расказваючы гэты эпізод, я не хачу, як Алег Белавусаў, ганіць універсітэцкую праграму і рашуча патрабаваць: чаму мне ніхто на лекцыі не сказаў, што ў сельскай гаспадарцы прымяняюцца гербіцыды, што цялят можна выпойваць штучным малаком? Я хачу толькі падкрэсліць, што на нялёгкім журналісцкім шляху сустрэнешся з тысячамі непрадбачаных пытанняў, якая б дасканалая ні была сістэма падрыхтоўкі работнікаў друку, якія б вопытныя выкладчыкі ні чыталі лекцыі і якім бы, нарэшце, дапытлівым і старанным ні быў студэнт. Наш час— гэта не пятнаццатае стагоддзе. Сёння не заўсёды разумеюць фізік фізіка, матэматык матэматыка. І проста несур'ёзна патрабаваць, каб будучаму журналісту універсітэт даў рэцэпты на ўсе выпадкі жыцця.

З гэтага натуральна вынікае пытанне, ці ёсць неабходнасць мяняць, удасканальваць сістэму падрыхтоўкі журналістаў? Можа існуючыя універсітэцкія праграмы з'яўляюцца бездакорнымі ва ўсіх адносінах? Відаць, не, калі імі не задаволены і ўчарашнія студэнты, і сённяшнія, і нават выкладчыкі.

Як вывучаецца на аддзяленні журналістыкі мова — галоўны інструмент журналіста? На лекцыях вам падрабязна раскажуць, як узніклі тыя або іншыя граматычныя катэгорыі, намалююць на дошцы становішча языка пры вымаўленні той або іншай літары, дакажуць, да якой часціны мовы трэба аднесці словы «гоп» і «шабулдых», а студэнт як рабіў на першым курсе ў дыктанце памылкі, так і робіць іх на пятым. Філолагу, вядома, не абысціся без ведання граматычных катэгорый, а журналісту, думаецца, лепш было б праслухаць курс «Мова Кузьмы Чорнага». Навошта заўтрашняму работніку друку забіваць галаву скланеннямі стараславянскай мовы, калі ён як след не ведае сучаснай? Магчыма, прыведзены прыклад — не зусім удалы, але выкладанне і мовы, і літаратуры, і іншых дысцыплін на аддзяленні журналістыкі не павінна весціся па такому ж прынцыпу, як на філалагічным факультэце.

Дух шкалярства, прымітывізму пануе ў выкладанні спецыяльных дысцыплін. Студэнт можа на «выдатна» здаць гісторыю рускай журналістыкі і партыйна-савецкага друку, не прачытаўшы ніводнага артыкула, фельетона Навікова, Герцэна, Альмінскага, Вароўскага, Кальцова. Галоўнае, што ад яго патрабуюць,—зазубрыць пэўныя назвы, даты, прозвішчы. Ведаеш канспект выкладчыка—малайчына! А як пісалі карыфеі журналістыкі, якімі мастацкімі сродкамі, лагічнымі прыёмамі карысталіся яны—гэта не так важна. Вось і выходзіць, што студэнт набівае галаву статыстычнымі звесткамі, якія нічога, акрамя трэніроўкі памяці, не даюць.

А вось яшчэ адзін парадокс. На пятым курсе студэнт павінен напісаць дыпломную работу. Якія тэмы прапануўвае яму кафедра? Самыя разнастайныя: «Публіцыстыка Ільі Эрэнбурга», «Сатыра і гумар у раённай газеце», «Памфлеты Яраслава Галана» і многія іншыя. Карацей кажучы, студэнту не абавязкова дэманстраваць аўтарытэтнай камісіі сваё ўменне пісаць публіцыстычныя артыкулы, памфлеты, фельетоны, нарысы. На абароне дыпломнай работы ён павінен паказаць свае даследчыцкія здольнасці. І толькі!

Больш разумна было б, каб заўтрашні работнік друку прадставіў камісіі свае ўласныя творы, а яна ацаніла б іх вартасць. Тады, напэўна, не сустрэў бы выпускніка аддзялення журналістыкі, які так і не напісаў у жыцці ніводнага радка, пайшоў працаваць адміністратарам кінатэатра ці ў спешным парадку перакваліфікаваўся на педагога.

Правільна ставяць пытанне ўдзельнікі размовы аб тым, што абітурыенты павінны трымаць творчы экзамен. Ад такіх тэм сачыненняў, як «Вобраз Анегіна», даўно пара адмовіцца.

Але ўявім ідэальны выпадак: на першы курс аддзялення журналістыкі паступіў здольны малады чалавек. І ўсё ж, калі ўсе пяць гадоў вучобы ён будзе толькі «набіваць галаву» тэарэтычнымі ведамі, а не стане сістэматычна ўдасканальваць творчае майстэрства, можна ўпэўнена сказаць, што прыйдзе ў рэдакцыю дыпламаваны спецыяліст «сляпым, бездапаможным кацянём». І правільна ставіць пытанне А. Белавусаў: творчай работай студэнтаў трэба кіраваць. Кіраваць так, як гэта робіцца ў тэатральных, мастацкіх і іншых спецыяльных навучальных установах. І зноў жа тут не павінна быць шаблону. Вопытным выкладчыкам, практычным работнікам друку на працягу універсітэцкай вучобы трэба пільна сачыць за творчым ростам студэнтаў, развіваць іх здольнасці, вучыць прафесіянальнаму майстэрству. Найбольш мэтазгоднай формай такой вучобы ўяўляюцца творчыя секцыі. У адной з іх маглі б займацца фельетаністы, у другой—нарысісты, у трэцяй—рэпарцёры. Галоўным зместам заняткаў павінен быць разбор матэрыялаў, напісаных студэнтамі, а не голая тэорыя. Такая форма работы з будучымі журналістамі завсцеражэ іх ад многіх памылак, прымусіць працаваць над удасканаленнем прафесіянальнага майстэрства.

Кіраваць творчымі секцыямі могуць і выкладчыкі універсітэта, і вопытныя работнікі друку. Практычную дапамогу кафедрам у арганізацыі такой вучобы павінен аказаць Саюз журналістаў БССР.

Такім чынам, мы бачым, што існуючая сістэма падрыхтоўкі журналістаў патрабуе перагляду. Зрабіць яе гнуткай, жывой і творчай адно Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, вядома, не здолее. На дапамогу яму павінны прыйсці выкладчыкі, работнікі друку, партыйныя работнікі.

Нельга не пагадзіцца з дацэнтам М. Цікоцкім, які сцвярджае, што журналісту трэба вучыцца «ўсё сваё жыццё, а не толькі пяць гадоў ва універсітэце». Пастаянныя сустрэчы з людзьмі, сістэматычная работа над кнігай узбагачаць работніка друку новымі ведамі. Ёсць нямала журналістаў, якія не вучыліся ва універсітэце, а дзякуючы сваёй настойлівасці, працавітасці, уменню аналізаваць жыццёвыя факты і з'явы сталі сапраўднымі майстрамі сваёй справы. Па эрудыцыі яны не ўступаюць дыпламаваным спецыялістам. Бывае ж і так: атрымае чалавек дыплом аб вышэйшай адукацыі і лічыць, што пакарыў усе вышыні навукі. Ён не працуе над сабой, скочваецца ў абывацельскае балота і, нарэшце, становіцца невукам. Так што дарэмна А. Белавусаў спалохаўся першых цяжкасцей, якія сустрэліся на яго шляху ў час практыкі. Жыццё — найлепшы настаўнік. Ні адзін універсітэт не ўзбагаціць так чалавека, як імклівая, шырокая, невычэрпная плынь жыцця.

Ул. СКАПА,
уласны карэспандэнт абласной газеты «Віцебскі рабочы».

ШЛЯХ У ТРЫ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ

Магілёўскаму абласному драматычнаму тэатру—30 гадоў

У ВОСЕНЬ 1935 года ў Барысаве на базе паўпрафесіянальнага тэатра рабочай моладзі спектаклем «Цудоўны сплаў» быў адкрыты адзін з першых калгасна-саўгасных тэатраў рэспублікі — Барысаўскі, які перабазіраваўся потым у Заслаўль. З нетраў гэтага калектыву і вырас наш Магілёўскі абласны драматычны тэатр.

Рэпертуар калгасна-саўгасных тэатраў з першых гадоў іх існавання будаваўся па прынцыпу найбольшага выкарыстання ўсяго багацця нацыянальнай драматургіі. Заслаўскі тэатр адразу ўстанавіў кантакты з К. Крапівой, Я. Маўрам, Ю. Рудзько, Ул. Стэльмахам і іншымі беларускімі драматургамі. У рэпертуар былі ўключаны такія п'есы, як «Партызаны», «Хто смяецца апошнім», «Канец маскараду», «Памылка» і шэраг іншых. Шырока былі прадстаўлены ў рэпертуары і творы драматургаў братніх рэспублік — «Слава» В. Гусева, «Чэсць» Г. Мдзівані, «Платон Крэчат» А. Карнейчука. Ставіліся і з поспехам ішлі п'есы Астроўскага, Гальдоні, Мальера.

Мастацка-творчы склад тэатра вырас у асноўным з актывістаў самадзейнасці. Атрымаўшы магчымасць аддаваць сябе цалкам любімай справе, здольныя ўдзельнікі самадзейнасці хутка раслі ў творчых адносінах. У чэрвені 1939 года ў Мінску на аглядзе калгасна-саўгасных тэатраў адным з лепшых спектакляў журы прызнала нашу пастаноўку «Партызанаў» па п'есе К. Крапівы.

Неўзабаве пасля стварэння Барысаўскага тэатра над ім бярэ шэфства Першы Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр. Увесь наш творчы склад на працягу года займаецца ў студыі тэатра тэатра. Там вядучыя майстры беларускай сцэны Літвінаў, Галіна, Шчансновіч, Рахленка перадавалі свой вопыт моладзі. Праз год педагогі і рэжысура падрыхтавалі з маладымі артыстамі спектаклі «Бацькаўшчына» па п'есе К. Чорнага, «Сваты» па п'есе І. Гурскага і канцэртную праграму.

Са спектаклем «Партызаны» тэатр выехаў у Маскву на Усесаюзны фестываль калгасна-саўгасных тэатраў. Работа трупы атрымала станоўчую ацэнку.

Са студзеня 1940 года тэатр пачаў стацыянарна працаваць у Пінску. Калектыў яго нямала зрабіў для абслугоўвання насельніцтва нядаўна вызваленых раёнаў Заходняй Беларусі.

Дзейнасць тэатра перарвала вайна. Многія ўдзельнікі тады пайшлі на фронт. Пасля вызвалення беларускай зямлі ад фашысцкіх захопнікаў тэатр зноў пачынае працаваць у Пінску. На сцэне ідуць «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона, «З народам» К. Крапівы, «Гэта было ў Мінску» А. Кучара. Прызнанне гледачоў заваёўваюць у гэтых спектаклях артысты Ю. Гальперына, А. Яфрэменка, С. Бульчык, С. Яворскі.

У пачатку 50-х гадоў у рэпертуар тэатра былі ўключаны такія п'есы беларускіх драматургаў, як «Пяюць жаўранкі» К. Крапівы, «Калі зацвітаюць сады» В. Палескага. «Алазанская даліна» К. Губарэвіча і І. Дорскага. Працягваюць хваляваць тэатр і гістарычная тэма, багацці беларускага фальклору. Былі паказаны спектаклі па п'есах «Несцерка» В. Вольскага, «Пінская шляхта». В. Дуніна-Марцінкевіча, «Паўлінка» і «Прымакі» Я. Купалы. Спектакль «Пінская шляхта» быў запісаны для радыё і ўвайшоў у фонд Усесаюзнага радыёвяшчання. Прыкметных поспехаў дабіваецца тэатр і пры ўвасабленні на сцэне рускай класікі («Рэвізор» Гогаля, «Васа Жалязнова» Горкага, «Лес» і «Таленты і паклоннікі» Астроўскага).

У 1954 годзе па рашэнню ўрада БССР тэатр пераводзіцца ў Магілёў. 29 кастрычніка адбылося першае знаёмства калектыву з гледачамі Магілёва, горада багатых тэатральных традыцый. У першы ж сезон тэатр паказаў магіляўчанам прывезеныя з Пінска спектаклі «Гібель эскадры», «Таня», «Іспанцы». Былі выпушчаны таксама «Яраслаў Мудры», «Іван Рыбакоў», «Чалавек з партфелем», «Гісторыя аднаго кахання».

З сярэдзіны 50-х гадоў у жыцці савецкага тэатра адбыліся сур'ёзныя зрухі, звязаныя з гістарычнымі рашэннямі XX з'езда КПСС. У рэпертуар нашага тэатра былі ўключаны п'есы, якія праўдзіва адлюстроўвалі жыццё і барацьбу савецкіх людзей за пабудову новага грамадства, за аднаўленне ленінскіх норм жыцця.

Для гэтага перыяду характэрны спектаклі «Персанальная справа» па п'есе А. Штэйна, «У добры час» па п'есе В. Розава, «Чаму ўсміхаліся зоркі» па п'есе А. Карнейчука. У рэпертуары з'явіліся і новыя п'есы беларускіх аўтараў— «Галоўная стаўка» К. Губарэвіча, «Дні нашага нараджэння» І. Мележа.

Асаблівую папулярнасць у гледачоў заваявалі спектаклі, у якіх быў увасоблены бессмяротны вобраз вялікага Леніна. Поспехаў у гэтай ролі дасягнуў у нашым тэатры народны артыст БССР С. Бульчык («Крамлёўскія куранты», «Імем рэвалюцыі», «Трэцяя патэтычная»).

За адзінаццаць гадоў, якія прайшлі з дня адкрыцця першага сезона на магілёўскай сцэне, мы паставілі 94 спектаклі, 69 з іх—па п'есах савецкіх аўтараў.

Зразумела, далёка не ўсё ў рабоце тэатра было аднолькава ўдалым — бывалі і няўдачы, і зрывы. Мы гэта ўсведамляем. Але натуральна, што сёння хочацца гаварыць пра тыя работы, якія пакінулі след у памяці гледачоў, былі нейкім чынам этапнымі і для самога тэатра. Назаву ў першую чаргу спектаклі «Людзі, якіх я бачыў», «Сэрцы павінны гарэць», «Усё застаецца людзям», «Узнятая цаліна». Сярод работ апошніх гадоў — «Пад адным небам», «104 старонкі пра любоў», «Шануй бацьку свайго».

Традыцыйнымі сталі нашы сувязі з беларускімі драматургамі. У нас убачылі святло рампы «Выбух» М. Гарулёва і М. Алтухова, «Вартыя шчасця» гамяльчаніна П. Дабравольскага, п'есы К. Губарэвіча, А. Маўзона, І. Мележа. Два гады працавалі мы з мясцовым драматургам Янкам Тарасавым над п'есай «Гэта было ў Магілёве». Спектакль паказаны ў тэатры ўжо восемдзесят разоў. Галоўны рэжысёр тэатра Б. Валадарскі працуе зараз з драматургам-магіляўчанінам І.Ісачанкам над п'есай, прысвечанай паўстанню Васіля Вашчылы.

Пяцідзесяцігоддзю Савецкай улады прысвечана наша апошняя работа — спектакль па п'есе Б. Лаўранёва «Разлом».

Аблічча тэатра вызначае яго творчы склад. Хочацца адзначыць, што больш дваццаці акцёраў трупы працуюць у нас ад дзесяці да трыццаці гадоў. Штогод калектыў папаўняецца і здольнай моладдзю. Гэта гарантыя, што тэатр і надалей будзе расці, развівацца.

...Пройдзены тры дзесяцігоддзі. Які ж наш сёння галоўны клопат? Ён той жа, што і ўсе гэтыя гады. — выхаванне калектыву, які здолеў бы вырашыць велічныя задачы, што ставіць перад намі час.

А. РАЕЎСКІ,
рэжысёр Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра.

І НАША ДУМКА

Алег Белавусаў пачаў размову пра падрыхтоўку журналістаў. На яго артыкул адгукнуліся журналіст С. Палякоў і дацэнт М. Цікоцкі. Нам таксама хочацца выказаць некалькі думак. Мы — студэнты, вучымся на трэцім курсе. Да паступлення ў БДУ імя Ул. І. Леніна працавалі не адзін год у раённых газетах. Так што трошкі паспыталі гэтага хлеба, пакаштавалі радасці і горычы.

Перш за ўсё, якім мы ўяўляем журналіста, такім, які «ў меру сваіх здольнасцей і спрыту прабіваецца ў газету» (словы А. Белавусава), ці такім, які «можа напісаць глыбокі публіцыстычны, літаратурна-крытычны або прапагандысцкі артыкул» (словы М. Цікоцкага)? Мы — за другога. За таго, які, перш чым набіць руку, «набівае» галаву.

Мы згодны з С. Паляковым і М. Цікоцкім, што журналісту перш за ўсё патрэбны глыбокія веды. Нам патрэбны філасофія і логіка, палітэканомія і псіхалогія. А калі ты студэнт-журналіст, дык вучыся яшчэ і пісаць. Увесь час вучыся. Няхай твае творы ляпяць у рэдакцыйныя кошыкі — не губляйся, пішы. Шукай сваё слова. Шукай сябе.

Некалькі думак аб вучэбным працэсе.

Як вядома, БДУ імя Ул. І. Леніна рыхтуе спецыялістаў, у асноўным, для рэспублікі. Выпускнікі аддзялення журналістыкі пойдуць у беларускія газеты. А ці ведаем мы беларускую мову? Скажам шчыра: не надта. Мы вывучалі родную мову на працягу двух год. Нас увесь час здзіўляў той факт, што заняткі па фізічнай падрыхтоўцы і на першым і на другім курсе праводзіліся два разы ў тыдзень, а лекцыя па беларускай мове была толькі адна. Цікава, што важней для журналіста: умець падцягнуцца на турніку сем разоў ці валодаць словам?

Чамусьці ўсе прадметы нам выкладаюць на рускай мове. Вывае так: прыходзіць выкладчык на першую лекцыю, знаёміцца з намі і пытае:

— На якой мове чытаць вам мой курс: на рускай ці на беларускай?

Хто-небудзь з задніх радоў гукне:

— На рускай.

— Ну, добра, — згаджаецца выкладчык, — на рускай дык на рускай. Мне ўсё роўна...

Можна было б і не пытаць у студэнтаў, на якой мове яны хочуць слухаць лекцыі. Мы лічым так: калі ты вучышся ва універсітэце, які носіць назву Беларускага дзяржаўнага, ты павінен ведаць беларускую мову не горш, чым рускую.

Далей. Нам прыемна сустракаць прозвішчы аднакурснікаў на старонках рэспубліканскіх газет. Радзей гучаць перадачы нашых сяброў у эфіры. І ўжо ніколі не сустрэнешся з імі на экранах тэлевізараў. Бо ва універсітэце з нас робяць толькі газетчыкаў, а не журналістаў у шырокім сэнсе слова. На лекцыях нам наведамляюць, што існуе радыё і тэлебачанне. Але ж ніколі не вядзецца спецыяльная размова пра гэтыя віды журналістыкі, не бываюць практычныя заняткі. А нам вельмі хацелася б пасябраваць з магнітафонамі-«рэпарцёрамі», пазнаёміцца з тэлестудыяй. Многія з нас пасля вучобы з ахвотай пайшлі б працаваць не толькі ў газету, але на радыё і тэлебачанне.

А. ГРАДЗЮШКА,
А. ЮДЧЫЦ,
студэнты 3-га курса аддзялення журналістыкі БДУ.

ТРЭБА ВЫБІРАЦЬ ЗДОЛЬНЫХ

Я стары газетчык. У раённай газеце працую з даваеннага часу. З вопыту ведаю, як цяжка даводзілася нам без вопытных журналісцкіх кадраў. У рэдакцыю мы бралі самавучак, якія толькі пачыналі пісаць.

Цяпер кадры журналістаў рыхтуе спецыяльнае аддзяленне БДУ. Рыхтуе ўжо доўгі час — два дзесяцігоддзі. Са сцен універсітэта выйшлі сотні спецыялістаў. Можна было б думаць, што газеты ў асноўным укамплектаваны. На жаль, сказаць гэтага нельга. У раёнах па-ранейшаму востры недахоп кваліфікаваных работнікаў.

Дзе ж асядаюць пасля вучобы выпускнікі з дыпломамі? Аказваецца, частка іх журналістамі становіцца выпадкова. На газетнае аддзяленне іншыя паступаюць для таго, каб атрымаць дыплом аб сканчэнні вышэйшай навучальнай установы. А потым адны ідуць працаваць настаўнікамі, другія ўладкоўваюцца наогул куды трапіцца. Карацей кажучы, ідуць не па той дарозе, якую выбралі сабе ўпачатку.

Прычын гэтаму многа. І самая галоўная тая, што ў БДУ не займаюцца сур'ёзна адборам абітурыентаў. На вучобу залічваецца абы-хто, варта толькі набраць пэўную колькасць балаў. Вучыцца чалавек і не ведае, як і дзе ён будзе працаваць. А калі становіцца газетчыкам, карысць ад яго невялікая.

Прыгадваецца такі выпадак. Аднойчы ў нашу газету на практыку прыехаў трэцякурснік. Колькі мы ні біліся, так і не дамагліся ад яго нічога. Пазней я даведаўся, што гэты газетчык, перакананўшыся ў сваёй бездапаможнасці, ву сім пакінуў універсітэт. А на яго ж вучобу дзяржава выдаткавала сродкі, яго недзе чакала рэдакцыя.

У дыскусіі падымаецца пытанне аб вучэбных дысцыплінах для журналістаў. Тав. Цікоцкі, напрыклад, за тое, каб іх было пабольш. Ён стаіць і за псіхалогію, і за гістарычную граматыку, і за іншыя навукі. Ніхто не збіраецца аспрэчваць, што кругагляд журналіста павінен быць шырокім. Але ж трэба ўлічваць спецыфіку работы. Я асабіста ўсё-такі за тое, каб глыбейшым было вывучэнне літаратурнага майстэрства. Бо рэдка хто з выпускнікоў добра ведае нават асаблівасці жанраў.

Хацелася б, каб на журналісцкім аддзяленні больш сур'ёзна ставіліся да вывучэння эканомікі. Не сакрэт, што ніводзін з выпускнікоў не хоча брацца за артыкул на эканамічную тэму. А калі і бярэцца, то пад прымусам, бо гэтага вымагае тэматычны план газеты. А без умення аналізаваць эканоміку пры сучасным вядзенні вытворчасці газетчыкам абысціся нельга.

І яшчэ адна заўвага. Не ведаю, хто ў гэтым вінаваты— вучэбныя планы ці выкладчыкі: выпускнікі слаба ведаюць тэхніку вёрсткі газеты. Прапануеш стаць сакратаром—адмаўляюцца наадрэз. Іншы можа правільна падлічыць радкі, але не ведае, як размясціць матэрыял, што і якім чынам выдзеліць. А правільна і цікава зверстаная газета — адзін з істотных бакоў яе культуры.

Б. САСНОЎСКІ,
адказны сакратар рэдакцыі лагойскай раённай газеты «Ленінскі сцяг».

ВЕЧАРЫ ХОЖАЎСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ

У Хожаўскай сельскай бібліятэцы наведвальнікаў заўсёды багата. Загадчыца бібліятэкі Алена Кісліцкая ветліва сустракае кожнага чытача. Дзяўчыне не трэба высвятляць, хто чым цікавіцца. Не адзін год яна працуе бібліятэкарам, і добра ведае ўсіх сваіх чытачоў. Вось, напрыклад, камбайнер Мікалай Еўстаф'евіч Хацько. Цікавіцца ён навінкамі беларускай літаратуры, сёе-тое бярэ і па сваёй прафесіі. Механізатар прачытаў раман Аркадзя Чарнышэвіча «Світанне», а цяпер бібліятэкарка раіць яму прачытаць «Засценак Малінаўна» таго ж аўтара, «Сэрца на далоні» І. Шамякіна, «Руіны страляюць ва ўпор» І. Новікава і іншыя.

Такіх кнігалюбаў у бібліятэцы больш сямісот.

У бібліятэкарні Алены Кісліцкай ёсць многа памочнікаў, людзей, якія любяць кнігу. Гэта работнікі фермы Таіса Шамшур, Зінаіда і Антаніна Вірынскія, загадчыца калгаснага клуба Антаніна Зайцава. І са школай наладжана цесная сувязь. Настаўніца Г. Козел, піянерважатая Марыя Завадская — першыя памочнікі бібліятэкаркі.

Актывісты клапоцяцца аб нагляднай агітацыі, праводзяць літаратурныя вечары і вечары адпачынку моладзі. Цікавым быў, напрыклад, літаратурны вечар на тэму «Каго з герояў прачытаных кніг мы возьмем з сабой у камунізм», дыспуты—«У чым тваё шчасце», «Тваё мары і погляды, малады чалавек XX веку» і многія іншыя.

Ул. МАНГІНОВІЧ.

Маладзечанскі раён.

Пра што не пішуць ў біяграфіі

КАВАЛАЧАК КАЗКІ

Толькі што закончыўся дзённы спектакль «Аленькая кветка». У зале ўсхваляваныя дзіцячыя твары. Любіць дзяцей, сябруе з імі Стэфанія Міхайлаўна Станюта. Дзе б яна ні была, заўсёды ў яе шмат юных сяброў. З ахвотай перадае яна ім сваю радасць, сваю любоў да хараства.

— Умееце з двух коркаў і запалак зрабіць цікавага звяркА? Не? Давайце навучу... А вось з шасці вялікіх шышак, двух зерняў кавуна і кізілавай костачкі можна зрабіць лесуна...

З розных лясных матэрыялаў Стэфанія Міхайлаўна ўмее рабіць самыя нечаканыя, сапраўды мастацкія мініяцюры. Гэта яе пастаянае захапленне, любімы занятак, да якога ў тэатры часам ставяцца трошкі з гумарам — дзівачка, маўляў. Дзівачка ж на гэта ўсміхаецца і заве да сябе дадому. Тут у яе чароўны куток прыроды. На сцяне прыладзіўся лесавік, прымацавана палічка з акасцянелага дрэвавага грыба, на якой страус і страусяня — з шышак і кляновых носікаў. Тут жа свінкі, ганарлівыя птушаняты і важны лясны ўладар — тыгр побач з пацешным сабачкам — Тузікам.

Летась Стэфанія Міхайлаўна прывезла з поўдня цікавыя карані.

— Гляньце, гэта ж сапраўдны Паганіні!

Ва ўзнёслым руху застыла рука са смычком. Здаецца, вось дакранецца яна да нябачнай скрыпкі, загучыць музыка — і ўсё гэта лясное сямейства, што сабралася на паліцах, на серванце, на стале, на падаконніку, зрушыцца, заскача, засмяецца..

Так, трэба валодаць чарадзейным вокам, каб сярод соцень тысяч звычайных сучкоў, пянькоў разгледзець створаны прыродай цуд.

— А вы ведаеце, — гаворыць Стэфанія Міхайлаўна, — што гэта нейкім чынам памагае мне ў рабоце над ролямі. Бачыш такую сціслую лаканічную фігурку, у якой нічога лішняга, і неяк выразней адчуваеш свае лішнія рухі на сцэне, разумееш скрытую глыбіню скупых жэстаў. Так непрыкметна памагаюць мне мае мілыя лясныя сябры.

Стэфанія Міхайлаўна прапаноўвае паказаць яшчэ нешта. Яна прыўзнімае сядзенне тахты і дастае адтуль скрынкі. Іх вельмі многа там. Яна адчыняе кожную, і пацеркі — зялёныя, залацістыя, карычневыя, матавыя і бліскучыя, дробныя і буйныя — мільгацяць перад маімі вачыма. Усё гэта з насення раслін і дрэў.

— Калі я куды-небудзь прыязджаю, першую свабодную хвіліну прысвячаю збіранню насення, разведваю, ці няма тут якіх новых раслін. Асабліва многа ў мяне насення беларускай флоры — дуба, вярбы, клёна, акацыі, вішні, слівы, яблыні, арэха; бабовых—фасолі, гароху, сачавіцы і лубіну; гарбуза, сланечніка, кавуна, кукурузы, проса, ільну, пшаніцы...

Стэфанія Міхайлаўна, нібы біёлаг, сыпле назвамі раслін, кветак, кустоў, непрыкметных траў. Як ведае і любіць яна прыроду! Я асцярожна перабіраю пацеркі. Не так гэта проста, як можа здацца, — нанізаць з зерня і насення нітку пацерак, каб ёй любаваліся.

— Часам костачку з плода хочацца адшліфаваць, пакрыць лакам,—тлумачыць Стэфанія Міхайлаўна. — Вось нітка пацерак з удала падабраных па колеру і малюнку костачак. Цяжка паверыць, што гэта — персікавыя костачкі.

Насенне павінна доўга сохнуць, яго трэба разабраць па колеру, форме, памеру. Часцей за ўсё пацеркі робяцца з такога сухога насення, што дзірачку даводзіцца свідраваць. Стэфанія Міхайлаўна дастае ўсё новыя і новыя каробкі... Прыгожа спляліся кафейныя і пшанічныя зярняты, нібы ўвасабляючы дружбу Беларусі і гарачай Афрыкі.

Стэфанія Міхайлаўна прыкладае да свайго зялёнага світэра нітку караляў, якія паблісквацць цьмяным бурштынам.

— Прыгожа?

Мне прыгадалася: сухенькія бабуліны рукі (спектакль у Тэатры імя Я. Купалы «Я, бабуля, Іліко і Іларыён») перабіраюць на грудзях бурштынавыя пацеркі. Няўдаліца Зурыко прымушае бабулю гневацца і праклінаць яго. Пастукваюць адна аб адну строгія, прыгожыя пацеркі — для касцюма бабусі Стэфанія Міхайлаўна выкарыстала свае пацеркі з зярнят кукурузы.

Сапраўды, як пасуюць яны ёй!

— А гэтыя нібы для вас, — гаворыць раптам Стэфанія Міхайлаўна, — вазьміце на памяць. Бачыце, як хораша!

Я надзяю іх — з туі і жалудовых шляпак. І бяру іх з сабой — як кавалачак казкі пра нашу прыроду.

Казкі ў доме народнай артысткі БССР Стэфаніі Міхайлаўны Станюты.

Браніслава ЛОБАН.

У час канцэртаў Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР часта выступае мужчынскі вакальны квартэт у складзе артыстаў М. Шуманскага, В. Юневіча, Ул. Туз, І. Підуля. Кіруе гэтым ансамблем Ул. Раговіч. У рэпертуары квартэта беларускія і рускія песні, перакладзеныя рускіх і заходнееўрапейскіх класікаў.

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

АПОВЕСЦІ, ЯКІХ НЯМА

Скажу адразу: пісаць пра кнігу В. Трыхманенкі вельмі цяжка. Цяжка зразумець, пра што яна, для кагo яна, дзеля чаго яна.

Вось аповесць, якая дала назву ўсёй кнізе.

Спачатку здаецца, што яна — дэтэктыўная, таму што ўжо на трэцяй старонцы яе разыгрываецца трагічная сцэна з забойствам камандзіра пасажырскага самалёта, з загадам другому пілоту змяніць курс і ляцець не на Сахалін, а на Хакайда— загадам, падмацаваным дулам рэвальвера.

Глеб Наважэнін, другі пілот, карыстаючыся тым, што бандыты не разбіраюцца ў паказаннях прыбораў, непрыкметна вяртае самалёт на ранейшы курс і робіць пасадку на сваім аэрадроме, атрымаўшы сем нажавых ран (зразумела, не смяртэльных: не можа ж галоўны герой аповесці, у якой сто шэсцьдзесят дзевяць старонак, памерці на сёмай!) Але з добрай пасадкай канчаецца і дэтэктыўны элемент аповесці.

Можна падумаць, што аповесць прысвечана гісторыі кахання Глеба Наважэніна і Ларысы Івановай, студэнткі медыцынскага інстытута, дачкі старога баявога палкоўніка. Але закаханыя, сустрэўшыся на першай старонцы, развітваюцца на другой і сустракаюцца яшчэ раз толькі на перадапошняй, перад гэтым не спрабуючы нават знайсці адно аднаго...

Магчыма, нарэшце, галоўнае ў аповесці — драма Віктара Калюжнага, улюбёнага ў неба лётчыка-знішчальніка, спісанага з часці па стану здароўя? Спярша Калюжнаму лёгка даецца ўсё, за што б ён ні браўся. Пасля ж яму не ўдаецца нічога, бо ён не вытрымлівае сур'ёзнага выпрабавання працай... Здаецца, ёсць усе падставы для стварэння паўнакроўнага мастацкага вобраза чалавека, які шчыра хоча і не можа стаць добрым камандзірам паветранага карабля, добрым мужам, бацькам. Аўтар заўважыў у характары героя шмат праўдзівага і супярэчлівага. Але ён паспяшаўся аблегчыць герою жыццёвы шлях нават у дні самых суровых выпрабаванняў. Спісаны з часці, Калюжны лёгка ўладкоўваецца на працу ў грамадзянскай авіяцыі. У дадатак высвятляецца, што ён нядрэнны мастак, і яго жонка, Даша, аказваецца, згадзілася ехаць з ім на Камчатку толькі дзеля таго, каб той «хлебнул там жизни» і стаў сапраўдным мастаком...

Адным словам, нялёгка знайсці асноўны «стрыжань» аповесці. Яшчэ цяжэй знайсці ў ёй канфлікты, — сутыкненні жыццёвых пазіцый і поглядаў розных людзей. Некалькі сямейных сварак не могуць ісці ў разлік, бо яны не робяць ніякага ўплыву на герояў аповесці. Праўда, час ад часу ўспыхваюць невялікія сутычкі паміж другараднымі героямі — напрыклад, паміж камандзірам карабля, членам парткома Курасавым і камандзірам экіпажа Ждановічам. Першы невядома чаму дрэнны, а другі невядома чаму добры. Ледзь не даходзіць да бойкі сутычка ў рэстаране паміж замаскіраваным пашляком Левандоўскім і адкрытым пашляком Гвалія. Але і яна канчаецца мірам.

І, нарэшце, нялёгка зразумець герояў аповесці. Кожны з іх — загадка, характары іх няўлоўныя, як ртуць. Разумная, прыгожая, добрая Даша ні з таго, ні з сяго называе свайго мужа «идиотом несчастным»; стаміўшыся на пірсе ў чаканні мужа, яна паводзіць сябе ашаламляльна: «...быстрая, хлёсткая пощёчина пришлась Виктору пониже виска. Он сделал вид, что ничего не произошло...» Надзвычай экспансіўны ў размове з дачкою бацька Ларысы, стары палкоўнік Іваноў: «Полковник сердился. Его всё больше раздражали вялые движения дочери, когда она вставала из-за стола, её стремление уйти, прекратить разговор... Александр Николаевич был готов ударить ее, но «зажал» себя, как он умел это делать».

Што ж да Віктара Калюжнага, дык гэта неверагоднае спалучэнне фразёра, рамантыка, аматара выпіць, паветранага зуха. Так і няясна, якая рыса вызначае яго характар. Узаемаадносіны ў яго сям'і таксама нейкія дзіўныя: то манілаўскія пацалункі, то ледзь не нянавісць. У фінале, праўда, усе супярэчнасці паміж мужам і жонкаю згладжаны з дапамогаю ашчаднай кніжкі: «Виктор сказал, что все деньги — Дашины, и весь вклад в сберкассу сделал на ее имя. В свою очередь, Даша великодушно разрешила мужу пользоваться сберкнижкой, что было узаконено соответствующей записью»...

Але што ж усё-такі ёсць у аповесці? Бо трэба ж было нечым запоўніць 169 старонак друкаванага тэксту...

У аповесці ёсць вельмі многае. Геаграфія — Мінск, Тбілісі, Баку, Петрапаўлаўск-Камчацкі, Сахалін, Хабараўск, Масква; падрабязнае апісанне кліматычных умоў, фауны і флоры, нораваў жыхароў; ёсць разважанні пра тэрмаядзерную вайну, пра сучасную навуку і дасягненні фізікі; успаміны пра мінулую вайну. («Больше суток храбро бились разведчики. Некоторые их танки и бронемашины уже не могли двигаться, но продолжали вести огонь, стреляя редко, с малой дистанции — только наверняка. Немало погибло людей»); ёсць выпадковыя сустрэчы, нечаканыя раставанні, вулканолагі, спекулянты лаўровым лістам, старшыні калгасаў, сельскія настаўнікі, чукчы.

У аповесці шмат скрупулёзных апісанняў рэйсаў, якія робяць пасажырскія самалёты. Іншы раз аўтар нават запаўняе старонкі запальчывай палемікай з уяўнымі скептыкамі, якія сумняваюцца ў прыгажосці палётаў, і выпіскамі з папулярных брашур, якія прапагандуюць дасягненні пасажырскага авіятранспарту, накшталт: «...Безопасность полётов — это главный закон гражданской авиации, это ее лучшая реклама. Скорость, удобство, экономия времени — все это, конечно, заманчиво для пассажиров, но он полетит только тогда, когда ему твёрдо пообещают благополучный возврат на землю. А уж если какие сомнения на этот счёт, то бог с вами и с вашей скоростью, пассажир возьмёт свой чемоданишко и перенесёт его на железнодорожный вокзал...»

Ну і нарэшце — мова аповесці. Як і многае ў «Сапраўднай вышыні», яна часта выклікае недаўменне. Мяркуйце самі: «радиокомпас и дистанционный магнитный компас для бандитов всё равно, что иконы, ничего им не покажут». Чаму ж абразы нічога не паказваюць? «Голубая, острая, как бритва, полоска рассвета на восточном горизонте (ці бываюць світанні на заходнім або паўднёвым гарызонтах?) заставила Глеба открыть глаза». Выходзіць, Глеб спачатку ўбачыў «полоску рассвета», а пасля прачнуўся. «Самолет... изрядно блудонул», — тут нават патрэбнага каментарыя не падбярэш...

Да гэтага часу мы не гаварылі аб другой аповесці — «Зноў на ўзлёт». Але ўласна гэта не аповесць, а звычайны газетны нарыс, толькі вельмі доўгі.

Сюжэт яе просты да прымітыўнасці: пасля сканчэння вайсковай акадэміі маёр Рагожын прыбывае служыць у авіяцыйнае злучэнне на ўсходнім узбярэжжы краіны, ляціць у камандзіроўку ў эскадрыллю, размешчаную на далёкім востраве, ускрывае сур'ёзныя недахопы ў баявой падрыхтоўцы лётчыкаў, вяртаецца дадому і кладзецца спаць. І ўсё. Гэтак жа просталінейна і ўсё астатняе ў аповесці: характары, праблемы, нават пейзажы...

Загортваючы кнігу, часта думаеш аб тым, якую карысць яна прыносіць людзям. У дадзеным выпадку я ўпэўнен, што кніга В. Трыхманенкі нікому карысці не прынясе. І дзіўна, няўжо гэтага не бачылі ў выдавецтве «Беларусь»?

Фёдар ЯФІМАЎ.

В. Трыхманенка. «Сапраўдная вышыня». Аповесці. На рускай мове. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1965.

САЛІСТ, ДЫРЫЖОР, ПЕДАГОГ

Сярод першых беларускіх артыстаў, канцэрты якіх пачулі па радыё жыхары вызваленага ад нямецка-фашысцкх захопнікаў Мінска, быў Георгій Жыхараў. Майстар ігры на балалайцы, вучань вядомага В. Карнілава, ён у лістападзе 1945 года стварыў секстэт домр, у рэпертуар якога ўвайшлі многія народныя песні і творы беларускіх кампазітараў.

Калі сёння ў рэспубліцы гучаць дзесяткі народных аркестраў, гучаць упэўнена і самабытна, дык у гэтым заслуга і таго першага паслявоеннага секстэта і яго стваральніка, цяпер дацэнта Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Г. Жыхарава.

Праводзячы вялікую работу як педагог, Георгій Іванавіч працягвае і дырыжорскую дзейнасць. Ён кіруе базіснымі аркестрамі музычнай школы № 2 і Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, аркестрамі народных інструментаў пры кансерваторыі і музычным вучылішчы імя М. Глінкі. У гэтых калектывах цікавы і разнастайны рэпертуар, яны вядуць вялікую работу па прапагандзе музычнай культуры. Георгій Іванавіч інструментаваў для аркестраў Пятую сімфонію Бетховена, Класічную сімфонію Пракоф'ева, увертюру да оперы «Руслан і Людміла» Глінкі, Прэлюдыю до-мінор Рахманінава, Другую венгерскую рапсодыю Ліста і шэраг іншых твораў. Зразумела, цэнтральнае месца ў рэпертуары займаюць беларускія творы, такія, як Сімфаньеты Чуркіна, Беларуская кадрыля Палонскага, Беларускія танцы Жыновіча, Палеская сюіта Глебава, Гумарэска і карагод Алоўнікава. Пастаянна гучаць на канцэртах вакальныя творы Пукста, Чуркіна, Семянякі, Лучанка, Смольскага.

Вучні Г. Жыхарава працуюць сёння выкладчыкамі ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, Мінскім педагагічным інстытуце, Гомельскім музычным вучылішчы, кіруюць шмат якімі аркестрамі.

Георгію Іванавічу споўнілася пяцьдзесят гадоў. Ад токара да саліста, дырыжора, мастацкага кіраўніка, педагога — такі яго творчы шлях.

З. НАСЦЕНКА.

У мінулую суботу ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі адбыўся вечар, прысвечаны 50-годдзю Г. Жыхарэва. Юбіляр дырыжыраваў аркестрам, які ён стварыў.

Іван Антонавіч Кацельнікаў з групай юных чытачоў грамадскай бібліятэкі.

Фота **В. ГЕРМАНА.** (БЕЛТА).

Галавеку гаварыць — ДЗЯКУЙ

ДУШЫ ЦУДОЎНЫЯ ПАРЫВЫ

Іван Антонавіч сядзіць за сталом. Перад ім стос часопісаў «Новый мир». З нейкім задавальненнем ён ставіць на тытульным лісце штэмпель і чарговы нумар. Я бяру зарэгістраваны часопіс, чытаю: «Грамадская бібліятэка домакіраўніцтва № 4. Рэгістрацыйны № 5032». Пераводжу свой позірк на паліцы з кнігамі. Цесна ім тут. Іван Антонавіч нібыта ловіць маю думку, тлумачыць:

— Цеснавата стала ўжо. І гэта ж не ўсе яшчэ кнігі. На руках іх многа. З тыдзень таму назад аднёс ладны стос кніг работнікам раённага сельгасупраўлення. Гэта нашы чытачы.

— А яшчэ куды вы іх носіце? — пацікавіўся я.

— У нас пры бібліятэцы створана пяць перасован. Мы носім кнігі ва ўсе ўстановы, што на тэрыторыі нашага домакіраўніцтва. Нясём людзям іх прама на работу. Разумееце, не ў кожнага знаходзіцца свабодны час, каб прыйсці ў бібліятэку...

— І многа ў вас чытачоў?

Іван Антонавіч разгарнуў сшытак.

— 367. А ўсяго два гады назад былі іх адзінкі...

...Два гады назад ліпеньскім вечарам ішло пасяджэнне дамавога камітэта. Пасля абмеркавання пытанняў парадку дня слова папрасіў намеснік старшыні дамкома Іван Антонавіч Кацельнікаў.

— Прапаную стварыць пры нашым дамкоме грамадскую бібліятэку, — сказаў ён і абвёў прысутных запытальным позіркам. На хвіліну ў зале ўсталявалася цішыня.

— Прапанова слушная, але дзе мы знойдзем памяшканне, дзе возьмем кнігі? — пачуліся ў адказ галасы.

— Пад бібліятэку я аддаю сваю адрыну, — сказаў Іван Антонавіч. — Падрамантуем яе да зімы. А кнігі збяром. Я гаварыў ужо з многімі жыхарамі. Яны згодны дапамагчы.

Пасля кароткіх спрэчак у той вечар і вырашылі стварыць бібліятэку. Тады ж абралі і яе грамадскі савет. Многа давялося будучаму загадчыку і савету бібліятэкі патрацціць часу і ўласных сродкаў, пакуль адрына не набыла належны выгляд. Збіралі кнігі. Звыш дваццаці тамоў прынесла былы старшыня дамавога камітэта Еўдакія Пятроўна Дрыга. Сам Іван Антонавіч аддаў бібліятэцы 200 кніг і часопісаў. Каля тысячы кніг і часопісаў падарылі новай бібліятэцы школьнікі горада...

Іншы раз Івана Антонавіча бралі сумненні: «Стараешся з усіх сілы, а чытачы раптам і не прыйдуць. У горадзе столькі бібліятэк. Каго можа прывабіць да сябе маленькая адрына?»

І можна ўявіць яго радасць, калі адночы на два ён сустрэў двух жанчын.

— Дзе тут наша бібліятэка? — спыталіся тыя.

Іван Антонавіч і павёў першых чытачак да адрыны. З цягам часу чытачоў сталілася ўсё больш і больш.

Надышла зіма. Холадна стала ў адрыне. Але два разы на тыдзень бібліятэка заўсёды была адчынена для наведвальнікаў. Азяблымі рукамі яны перабіралі кнігі, адшукваючы патрэбную. І тады, як ніколі раней, Іван Антонавіч адчуў важнасць сваёй работы. Забываючы пра холад і няўтульнасць, ён скідваў паліто, дацягваўся да верхніх паліц, прапаноўваючы чытачам кнігі.

А праз год грамадская бібліятэка была пераведзена ў добраўпарадкаванае памяшканне. Зноў пачалася работа — трэба было абсталяваць пакой. На дапамогу Кацельнікаву прыйшла грамадскасць.

— Многія мне дапамагалі, — з гордасцю гаворыць Іван Антонавіч. — Андрэй Гаўрылавіч Пашын, палкоўнік у адстаўцы, пафарбаваў падлогу, стэлажы, рэгістраваў кнігі. Антаніна Аляксееўна Дуброўская пабяліла сцены... І зараз я адзін бы не справіўся, калі б не грамадскасць. Усё робяць члены савета бібліятэкі: прыбіраюць памяшканне, ацяпляюць яго, дзяжурыць.

І толькі пра сябе прамаўчаў Іван Антонавіч. Ён не сказаў, што сваімі рукамі нарыхтаваў дроў на зіму, што кожны дзень ходзіць нястомна па бібліятэках горада, адшукваючы патрэбную кнігу, на якую чытач даў заяўку. Не сказаў і пра тое, што праз дзень, нагрузіўшыся кнігамі, ён пакінае іх людзям. І гэта яшчэ не ўсё. Работнікам рамонтна-будаўнічага ўпраўлення горада надоўга запомніўся вечар на тэму аб сумленні і годнасці рабочага, арганізаваны Іванам Антонавічам. А колькі ім зроблена кніжных выставак, цікавых выступленняў перад чытачамі!

...Я гляджу на сухарлявы маршчыністы твар Івана Антонавіча і здзіўляюся яго жыццярадаснасці. Яму сёмы дзесятак. Пяты год ён ужо на пенсіі. Але не скажаш, каб ён адпачываў спакойна. Няўрымслівы, бадзёры, Іван Антонавіч працягвае дарыць людзям радасць. А яны ў сваю чаргу плацяць яму шчырай падзякай.

І. ДАШЧЫНСКІ.

Брэст.

На думку чытача

НЕ ЎСЕ СПАДЗЯВАННІ СПОЎНІЛІСЯ

Зусім нядаўна давялося мне прачытаць кнігу Э. Агняцвет «Лірыка». Прызнаюся, раней імя паэтэсы сустракалася мне часцей пад вершамі для дзяцей. І таму я з цікавасцю ўзяў у рукі яе «дарослую» кніжку.

Чытаю першы верш — «Не быў філосафам глыбокім...» У ім паэтэса расказвае пра селяніна, які ў семнаццатым годзе не вагаючыся стаў на бок бальшавікоў, і не таму, што «яму прыйшлося да спадобы калісьці слова «бальшавік», а таму, што

На свеце большасць — гэта людзі,
Якія мяюць мазалі.
Збярэцца разам большасць — будзе
Больш хлеба, сонца і зямлі.

І селянін галасуе за гэтую большасць, не ведаючы яшчэ, што галасуе за новае жыццё, за партыю, за Ільіча.

Верш гэты спадабаўся мне сваёй прастатой, натуральнасцю інтанацый, светлым пафасам.

Мужнасцю і суровасцю гучання запомніўся мне і верш «Апасіянната».

Аднак, шчыра кажучы, большасць вершаў зборніка не хвалюе. Залішне шмат у ім, калі можна так сказаць, лірыкі дзеля лірыкі. Як верш «Поўнач б'е!», напрыклад:

Поўнач б'е.
Але нэўмысля
Пеша мы ідзём з вакзала.
Вокны спяць.
Горад спіць.
Ноч!

Не ведаю, можа я чаго не разумею, але ўспрымаць гэтыя радкі як верш, як паэзію я не магу.

Акрамя гэтага, шмат у кнізе моўных неахайнасцей, прыблізных рыфмаў, сэнсавых недакладнасцей.

М. ПІНЧУК,
студэнт БДУ імя Ул. І. Леніна.

КАСЦЁР МОГ БЫЦЬ ЯРЧЭЙШЫ

На паліцах дзіцячай літаратуры з'явілася яшчэ адна кніжка—«Костер» М. Гелера. Выйшла яна ў выдавецтве «Беларусь». Невялікая, крыху больш двух дзесяткаў вершаў. Адкрываецца яна кароценькім — усяго пяць радкоў — вершам «Сакавік»:

День — длиннее,
Солнце — выше,
И в прозрачной тишине
Дряхлый снег свалился с крыши
Прямо под ноги весне.

Маляўнічы, лаканічны малюнак надыходу вясны. Здаецца, нават чуеш той глухі гук, калі шлёпае на дол камяк рыхлага сакавіцкага снегу.

З цікавасцю стаў гартаць кніжку.

Вось другая замалёўка, таксама невялічкая:

Рядом с речкою песок
Загорать на солнце лег.
Загорает день за днем,
А загара нет на нем.

Ненадакучліва, свежа і хораша.

Паэт (а ўслед за ім і чытач) часта спыняецца ў здзіўленні перад таямніцамі прыроды, нібы ўпершыню бачыць перад сабой і «дряхлый снег», які зваліўся «прямо под ноги весне», і пясок, які «загорать на солнце лёг», і туман, які ў рацэ «промок».

Вершы, пра якія мы гаварылі (ды і некаторыя іншыя), — сапраўдныя, цікавыя, вобразныя і запамінальныя. Але побач з імі мірна жывуць і творы недасканалыя, а то і проста слабыя. Вось верш «Якога колеру лета»:

Я видел лес и поле.
На речку я смотрел:
Какого цвета лето,
Узнать я захотел...

Далей пералічваецца, што лес зялёны, рэчка сіняя, пшаніца залатая, грэчка белая, і робіцца вывад: лета рознакаляровае! Правільна і даўно вядома — і аўтару, і юнаму чытачу.

Многія вершы зборніка грашаць, калі можна так сказаць, зададзеным маралізмам. Паэт бярэ мараль і піша пад яе верш, напрыклад, «Для чаго патрэбны рукі». Яшчэ акцябраты ведаюць: калі сябра ў бядзе — яму трэба працягнуць руку. І вось аўтар ілюструе гэтую думку:

Для чего нужны нам руки?
Чтобы мы не знали скуки. — (?)
Пололи, строгали,
Гребли и удили,
Мячи подавали. (?)
Костры разводили.
И если вдруг
В беде наш друг,
То выход есть простой:
Протянем руку мы ему—
И кончено с бедой.

Даволі часта ў кніжцы сустракаюцца творы, ад якіх павявае вельмі знаёмым, даўно чутым ці чытаным. Вось у вершы «Клён» гаворыцца пра тое, што як дождж ні стараецца патушыць «пажар» на лісцях асеннята клёна, яму гэта не ўдаецца зрабіць. Напісана быццам бы і бойка, але хто толькі не тушыў «пажары» на клёнах!

Шмат апісальнасці, літаратуршчыны і пустаслоўя ў вершах «Зарадка», «Марш», «Адкуль гэты цуд», «Па заданню вясны...»

Возьмем верш «Па заданню вясны». Яго хочацца прывесці поўнасцю:

Ух, какой,
Ух, какой
Ходит стук
По мастерской!
Молотками бьет
Сейчас
Пятый класс,
Дружный класс.
Ну, конечно,
Ну, конечно,
Он из солнечной (?) сосны
Ладит звонкие (?) скворечни
По заданию
Весны.

Здаецца, усё гучна і адмыслова: «дружный», «солнечная», «звонкие»... Але як усё гэта пуста, як усё гэта пралятае і міма вуха і міма сэрца чытача.

Што ж хочацца сказаць у заключэнне? Шкада, што добрае ў кніжцы засланяецца выпадковым і недапрацаваным. Шкада, што аўтар, які ўмее глядзець на свет вачамі першаадкрывальніка, ахвотна карыстаецца ўжо даўно заезджанымі трафарэтамі. Ад гэтага «Касцёр» шмат прайграе.

М. БАГДАНОВІЧ.

ПА СЦЕЖКАХ ЛІТАРАТУРЫ

Калі вы хочаце праверыць свае веды па роднай літаратуры ці зрабіць цікавае падарожжа і сустрэцца з добрымі старымі сябрамі — літаратурнымі героямі, вазьміце гэтую кніжку. Яна невялічкая, называецца проста — «Літаратурныя гульні». Склаў яе Іван Говар, а выпусціла «ў людзі» выдавецтва «Народная асвета». Гартаеш яе старонкі і з галавой акунаешся ў цікавы свет літаратурных герояў, свет кніг, свет паэзіі.

І толькі пра апошні раздзел кніжкі «Ці ведаеш ты, што...» трэба сказаць крытычнае слова. Тут, мне здаецца, складальнік перастараўся і ўключыў шмат неістотных, малазначных фактаў з жыцця тых ці іншых пісьменнікаў.

Ул. ІВАШКА,
студэнт.

ТВОРЧАЯ СПРАВАЗДАЧА

У секцыі дзіцячай і юнацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР усталявалася добрая традыцыя—перыядычна заслухоўваць справаздачы пісьменнікаў. Нядаўна тут абмяркоўвалася творчасць В. Хомчанкі. А чарговае пасяджэнне секцыі было прысвечана творчай справаздачы Хв. Жычкі.

Дакладчык Ул. Жыжэнка падрабязна спыніўся на мастацкіх вартасцях і недахопах кніг Хв. Жычкі «Піфагоравы штаны», «Каштанавы «масквіч», «Зорачка-пяцёрачка» і «Зброю бяруць сыны».

Шмат цікавага і карыснага пра творчасць Хв. Жычкі выказалі А. Якімовіч, С. Міхальчук, М. Герчык і іншыя.

У заключэнне Хв. Жычка расказаў аб сваіх задумах і планах, аб новай кнізе «Паспелі суніцы», якая неўзабаве выйдзе з друку.

Водгукі, адказы

«ВАЛ» І ХАЛТУРА

«Кошачкі», «лебедзі», штучныя бавоўняныя кветкі... Каму не абрыдла гэта базарная прадукцыя! Але з некаторай пары ў ананімных халтурщыкаў паявіліся канкурэнты. Безгустоўныя вырабы валам пачалі выпускаць Бабруйскі камбінат надомнай працы, добрушская папяровая фабрыка «Герой працы», Мінская фабрыка мастацкіх вырабаў.

Ананімам тыражыраванай халтуры была прысвечана ў нашай газеце рэпліка пад рубрыкай «Аўтара!» (гл. «Літаратуру і мастацтва» ад 5 стапада).

Рэдакцыя атрымала шматлікія водгукі на гэта выступленне.

Выканком Бабруйскага гарадскога выканкама... путатаў працоўных, абмеркаваўшы рэзалюцыю дэпутатаў, што на камбінаце надомнай працы праведзена спецыяльная нарада. Выпуск малюнак «Кот» на сувенірныя сумкі... ны па распараджэнні брыгадзіра А. Ф... яго, а таксама на галоўнага інжынера Г. Ціткова накладзены спагнанні.

Безгустоўны малюнак на сувеніры... ініцыятыве работніка, які з мастацтвазнаўства... агульнага не мае. А вось аўтарам безгустоўнага малюнка на сшытках Добрушскай паперовай фабрыкі аказаўся мастак з вышэйшай адукацыяй. Як паведаміў рэдакцыі Добрушскі РК КПБ... рыка у 1964 годзе заказала Гомельскаму аддзяленню Мастацкага фонду серыю малюнкаў на тэму «Ахова прыроды». У серыю трапілі і «лебедзі» — як замалёўка з Гомельскага парку культуры і адпачынку. Аўтар яе — член Саюза мастакоў БССР Л. Пакаташкіна. Малюнак павінен быў зацвердзіць мастацкі савет, але, хоць віза на малюнку і ёсць, савет у сапраўднасці не збіраўся. Гэты факт прымушае задумацца аб парадках, якія пануюць у Гомельскім аддзяленні Мастацкага фонду.

Рэпліка «Ананімы халтуры» абмяркоўвалася і на Мінскай фабрыцы мастацкіх вырабаў. «Мы ўжо шмат гадоў, як робім гэтыя кветкі, і ўстанавіць сёння, хто аўтар узораў, якія ўзяты за эталон, немагчыма», — паведамляе дырэктар фабрыкі Р. Ісачанка. Згаджаючыся з крытыкай газеты, тав. Ісачанка з трывогай піша, аднак, што «план па кветках» ужо даведзены фабрыцы і на 1966 год.

Рэдакцыя звязалася з рэспубліканскім Упраўленнем мастацкай прамысловасці. «План па выпуску кветак Мінскай фабрыцы мастацкіх вырабаў сапраўды даведзены, — пацвердзіла начальнік упраўлення В. Кенгурава. — Справа ў тым, што ў нас заключаны дагаворы з гандлёвымі арганізацыямі. Аднак упраўленне, лічачы крытыку газеты правільнай, зараз прымае меры, каб ліквідаваць цэх кветак, выключыць гэты від прадукцыі з плана і перакваліфікаваць рабочых».

«Мы вытворчасць кветак спынім, — дадала ад сябе Валянціна Аляксандраўна. — Але ж не адны мы вінаватыя, штучныя кветкі выпускае і вытворчы камбінат Беларускага тэатральнага аб'яднання. Відаць, крытыка датычыць і яго...»

Так, выступленне газеты датычыць і Беларускага тэатральнага аб'яднання, аднак да гэтага часу ад БТА рэдакцыя водгуку не атрымала. У свой час пры камбінаце БТА быў створаны цэх, каб забяспечваць штучнымі кветкамі тэатры. Працавала ў ім тры рабочыя. Цяпер іх дваццаць восем, і кветкі ідуць валам. Трэба спадзявацца, што праўленне Беларускага тэатральнага аб'яднання прыме меры. і спыніць выпуск халтурнай прадукцыі.

Выходзяць на экраны

«МАСТАК МАЯКОЎСКІ»

Уладзімір Маякоўскі быў не толькі паэтам, але і таленавітым мастаком. У яго спадчыне ёсць шаржы, рэклямы, партрэты, графіка, плакаты, тэатральныя дэкарацыі.

Фільм прысвечан розным этапам творчасці Маякоўскага: вучоба ў ВХУТЭМАСе, работа ў РОСТА, стварэнне рэклам Массельпрома.

Вытворчасць Ленінградскай студыі навукова-папулярных фільмаў. Аўтар сцэнарыя і рэжысёр — Г. Брусе.

«РЭПАРТАЖ З ФЕСТЫВАЛЮ»

У фільме расказваецца аб буднях IV Міжнароднага кінафестывалю ў Маскве, аб цікавых сустрэчах зарубежных гасцей з жыхарамі савецкай сталіцы.

У карціне гледачы ўбачаць папулярных зорак сусветнага экрана, разам з імі пабываюць на кінастудыі «Масфільм», у зале Палаца з'ездаў, дзе адбываліся конкурсныя прагляды фільмаў, пазнаёмяцца з многімі дзеячамі кінамастацтва.

Вытворчасць Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў. Аўтар тэксту — Д. Радоўскі, рэжысёр — В. Катанян.

«ЛА СКАЛА» Ў МАСКВЕ»

Гэты фільм аб гастролях італьянскага тэатра «Ла Скала».

У карціне выкарыстаны ўрыўкі з опер «Турандот», «Севільскі цырульнік», «Лючыя дзі Ламермур», «Багема».

Фільм завяршаецца выкананнем «Рэквіема» Вердзі.

Вытворчасць Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў. Аўтар сцэнарыя — В. Камісаржэўскі, рэжысёр— С. Рэпнікаў.

«1200 ЗОРАК»

Фільм расказвае пра паездку прадстаўнікоў мастацкай самадзейнасці Украіны ў Маскву і Ленінград, пра атмасферу дружбы і сімпатыі, якія панавалі ў час гэтых гастроляў.

Вытворчасць Украінскай студыі хранікальна-дакументальных фільмаў. Рэжысёр— Р. Нахмановіч.

ДАРАДЧЫК НА ШТОДЗЕНЬ

У гэтай кніжцы — значная заслуга перад беларускай літаратурай. Менавіта яна пачала ўводзіць у прывабны свет літар хлопчыка Івана Луцэвіча, будучага Янку Купалу. Пасля на яе старонках упершыню ўбачылі свет многія вершы Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Цёткі, Змітрака Бядулі і іншых перадавых беларускіх пісьменнікаў. На доўгія гады яна заставалася своеасаблівай падцэнзурнай поштай, якая несла пад сялянскую страху палкую думку аб сацыяльным і нацыянальным разняволенні народа.

Кніжка гэтая — звычайны каляндар. Так, самы звычайны каляндар, які ёсць бадай у кожнай сям'і і які стаў у хаце такой жа неабходнай рэччу, як, напрыклад, гадзіннік.

Магчыма, я не стаў бы пісаць гэтых радкоў пра кніжку на штодзень, калі б не дзве акалічнасці. Нядаўна мне трапіўся на вочы артыкул з «Літаратурної України», у якім вялася размова па пытаннях культуры мовы на старонках украінскага адрыўнога календара. Размова цікавая і патрэбная, бо чатыры мільёны ўкраінскіх сем'яў (такі, калі не памыляюся, тыраж календара) гартаюць гэтую кніжку кожны дзень.

Па-другое, набліжаецца Новы год, і, зусім слушна, кожны імкнецца набыць сабе новы каляндар. У Цэнтральнай мінскай кнігарні мне прапанавалі «Календарь для женщин», «Календарь школьника», проста «Календарь», але беларускага адрыўнога календара паказаць не змаглі — нашы выдавецтвы чамусьці дагэтуль не збяруцца выпусціць яго, хоць пра неабходнасць гэтага ўжо неаднойчы пісалася. Безумоўна, цэнтральныя календары, якія ёсць на кніжным рынку, у некаторай ступені кампенсуюць гэты недахоп. Але толькі ў некаторай ступені.

Сапраўды, любы каляндар абмежаваны ў сваім фармаце колькасцю гадавых дзён. Таму, як бы ні стараліся складальнікі «Календаря», на якія б хітрыкі ні ішлі, яны ўсё роўна не змогуць удзяліць патрэбную колькасць старонак літаральна ўсім раёнам Савецкага Саюза, розным як па прыродных умовах, так і па нацыянальным складзе насельніцтва. Ды складальнікі (што абсалютна правільна) і не імкнуцца да гэтага: каляндар разлічаны ў першую чаргу на чытача рускага...

Але ж каляндар — гэта не толькі паказальнік чысла, назвы дня і месяца. Гэта — часамі незаменны дарадца ў тых альбо іншых пытаннях, своеасаблівая хатняя энцыклапедыя. «Калі і дзе лепш пасадзіць сад?»; «Якія свойскія грыбы і ягады растуць у лесе?»; «Якія планеты можна бачыць у небе?»; «Дзе і што можна паглядзець турысту, які рыштунак трэба яму браць у дарогу?» Гэтыя і сотні іншых пытанняў хвалююць шматлікіх чытачоў кнігі на штодзень. І адказы, безумоўна, будуць не аднолькавыя для ўмоў, напрыклад, сярэдняй часткі Расіі, Сібіры і Беларусі.

Ці возьмем такое пытанне. Многімі імёнамі, мясцінамі, датамі беларусы па праву могуць ганарыцца. Але часамі для ўсесаюзнага чытача яны не маюць істотнага значэння. Толькі гэтым, відаць, можна вытлумачыць тое, што ў «Календаре» на 1966 год не адзначаны такія даты, як 60-годдзе з пачатку літаратурнай дзейнасці і 10-годдзе з дня смерці Якуба Коласа, 70-годдзе з дня нараджэння Кандрата Крапівы, 45-годдзе з дня заснавання БДУ імя Ул. І. Леніна і інш. (Я бяру тут толькі некаторыя імёны і даты, звязаныя з культурай рэспублікі).

Нарэшце — пытанне культуры роднай мовы. Беларускі адрыўны каляндар, без усялякіх сумненняў, разыдзецца ў сотнях тысяч экземпляраў. І раздзельчыкі «Ведай і любі свой край і мову», «Гаварыць правільна» і г. д. могуць саслужыць тут добрую службу. Бо не сакрэт, што лічаныя кніжкі па культуры роднай мовы, накшталт «Пытанні культуры мовы» Фёдара Янкоўскага, выдадзеныя мізэрнымі тыражамі, з'яўляюцца цяпер бібліяграфічнай рэдкасцю, іх не мае нават пераважная большасць спецыялістаў-філолагаў.

Хочацца некалькі слоў сказаць і пра настольны каляндар. Настольны «Беларускі каляндар» вось ужо дзесяты год выдае Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Беластоку. Тыраж яго, здаецца, ні разу не апускаўся ніжэй чатырох тысяч. Гэта ў той час, калі ў Польшчы жыве толькі крыху больш як дзвесце тысяч беларусаў. Відаць, падобнае выданне знайшло б вялікі попыт і ў нас, асабліва ў вёсцы. У ім можна было б змяшчаць больш разгорнутыя парады па агратэхніцы, карысныя парады для хатняй гаспадаркі, розныя цікавыя фотаздымкі, краязнаўчыя нататкі, ноты і словы любімых песень і іншае.

Аднак я, здаецца, загаварыўся і пачаў складаць праспекты беларускіх календароў — і адрыўнога, і настольнага. Гэта, безумоўна, могуць зрабіць намнога лепш за мяне спецыялісты-складальнікі, якім адно з нашых выдавецтваў даручыць гэтую справу. Хацелася б толькі, каб такія кніжкі на штодзень абавязкова выйшлі ўжо да чырвонай даты — 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

В. РАГОЙША,
аспірант БДУ
імя Ул. І. Леніна.

ВІЗІТЫ СЯБРОЎ



На гастролях у Мінску пабывала заслужаная харавая капэла Украінскай ССР «Трэмбіта». Яна выступіла з вялікім канцэртам, складзеным з класічных, старадаўніх і сучасных украінскіх твораў. Захапленне прысутных выклікала выкананне беларускіх песень. Нашы госці выступілі таксама з канцэртам па Мінскім телебачанні.

Пачаў свае гастролі ў Мінску калектыў артыстаў савецкага цырка. Выступленні пачаліся вялікай праграмай «Сустрэча зімы». У ёй прымаюць удзел пакстраныя гімнасты Папазавы, жанглёры-антыподысты Мініцюк, велафігурысты Асмус, акрабаты Фядосавы і іншыя. Закан'чваецца праграма выступленнем «Забаўных мядзведзяў» пад кіраўніцтвам Э. Эльворці. У праграме прымае ўдзел заслужаны артыст РСФСР Б. Вяткін.
НА здымку—выступае Э. Эльворці.

Фота Ул. КРУКА.

ЦІКАВЫ ДАКУМЕНТ

У матэрыялах Мінскай дырэкцыі народных вучылішч аказаўся спіс зведзеных настаўнікаў і выключаных вучняў і выхаванцаў навучальных устаноў Расіі за 1871—1891 гг. У гэтым спісе значыцца імя будучага вялікага рускага пісьменніка Караленкі, у той час — у 1876 г. — студэнта Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі. Як відаць з дакумента, па распараджэнню Міністэрства народнай асветы, паведамленага ў цыркуляры папячыцелю Віленскай вучобнай акругі ад 1876 г., Ул. Г. Караленка быў выключаны з акадэміі за ўдзел у напісанні дырэктару калектыўнай заявы студэнтаў з патрабаваннем змяніць існуючыя паліцэйскія парадкі ў акадэміі.

Пры апрацоўцы дакументальных матэрыялаў у Цэнтральным гістарычным архіве БССР знойдзены дакумент, звязаны з імем Уладзіміра Галакцёнавіча Караленкі.

УНУКІ І ПРАЎНУКІ БАТЛЕЕЧНІКАЎ

А. ЛЯЛЯЎСКІ,
галоўны рэжысёр Дзяржаўнага тэатра лялек.

Днямі ў Мінску закончыўся першы рэспубліканскі агляд самадзейных лялечных калектываў.

Калі адкрывалася цяжкая чырвоная заслона вялікай залы Палаца культуры прафсаюзаў, на сцэне з'яўлялася яшчэ адна сцэна — маленькая, са сваёй уласнай заслонай, што адкрывалася ўслед за вялікай. На гэтай другой сцэне на фоне дэкарацый рухаліся лялькі — маленькія фігуркі людзей і жывёл. Лялькі размаўлялі, спявалі, танцавалі. Галасы ў іх былі высокія, дзіцячыя—за шырмай жа былі дзеці.

У зале таксама сядзелі дзеці—школьнікі першых класаў. Яны не адрывалі вачэй ад лялек, дружна дапамагалі, калі іх аб гэтым прасілі, і дружна апладзіравалі ў такт любімым мелодыям або калі маленькая заслона закрывалася.

Спектакляў было многа —«Казка пра казла», «Падарожжа Нязнайкі», «Стары Хатабыч», «Заяц, Ліса і Певень» і шмат іншых. Усе яны выконваліся дзецьмі і былі адрасаваны дзецям. Нават «дарослыя» калектывы паказвалі дзіцячыя п'есы. Лялечнікі з Рэчыцы ігралі казку «Смолка», а навагрудскі калектыў — дзіцячую п'есу «Заяц і Кот». Толькі адзін калектыў — агітбрыгада са Стаўбцоў—дала лялечны сатырычны паказ, адрасаваны дарослым. Называўся ён «Дзядзька Вожык».

Можна лічыць, што ўвесь агляд аказаўся своеасаблівым святам дзіцячай творчасці. Лепшымі спектаклямі, сыграннымі сіламі школьнікаў, журы прызнала «Два майстры» (12-я школа Віцебска), «Бек! Мек! Чур!» (Мінскі Палац піянераў), «Казка і Праўда» (дзіцячы Дом культуры Аршанскага льнокамбіната), «Падарожжа Нязнайкі» (Брэсцкі Палац піянераў). Першае месца сярод дарослых калектываў заняў Стаўбцоўскі агіткалектыў.

Агляд паказаў, што лялечнае мастацтва, якое карыстаецца вялікай любоўю ў дзяцей і дарослых, можа быць цікава выкарыстана ў мэтах выхавання. Але таму, што лялечная самадзейнасць (асабліва дарослая) — справа новая і куды больш складаная, чым гэта здаецца на першы погляд,— жанр гэты патрабуе асаблівай увагі і падтрымкі.

Цяпер у Беларусі каля тысячы самадзейных лялечных калектываў. Імі кіруюць энтузіясты - педагогі, важатыя, клубныя работнікі, пенсіянеры. Амаль нічога не атрымліваючы за гэта, яны выконваюць работу, значна большую долю кіраўнікоў іншых калектываў. Кіраўнік-лялечнік павінен не толькі знайсці п'есу і адрэпетыраваць яе як рэжысёр, але і займацца вырабам лялек, абсталявання, навучыць гурткоўцаў кіраваць сваімі артыстамі, паставіць нескладаны танец, развучыць песенькі. Усяму гэтаму трэба вучыцца, але метадычнай літаратуры амаль няма (асабліва ў сельскай мясцовасці), п'ес мала, а сродкі, каб набыць тканіну для сцэны і касцюмаў, не выдзяляюцца. Нават калектывы, якія знаходзяцца пры вялікіх дамах культуры, не маюць пастаяннага памяшкання для заняткаў і хавання маёмасці!

Агляд паказаў, што трэба актыўна прыцягваць мастакоў (прафесіянальных і самадзейных) для афармлення спектакляў, вырабу лялек і дэкарацый. На жаль, нават у дамах піянераў і вялікіх клубах, дзе ёсць мастакі і кіраўнікі студый выяўленчага мастацтва, лялечнікі вымушаны абыходзіцца сваімі сіламі. У выніку — невыразныя, непрыгожыя лялькі, безгустоўныя шырмы, прымітыўныя, натуралістычныя дэкарацыі.

Лялечны паказ немагчымы без музыкі. Але пакуль музычнае афармленне спектакляў дрэннае. Толькі да аднаго-двух паказаных на агляде спектакляў музыка была напісана спецыяльна, а не падбіралася. Напэўна, сярод маладых самадзейных музыкантаў ёсць і кампазітары. Магчыма, некаторых з іх можна зацікавіць лялечным мастацтвам, і яны з ахвотай возьмуцца за цікавую справу.

На аглядзе ні адзін спектакль не ставіўся пад музыку, запісаную на магнітафонную плёнку. Між тым, запіс дае магчымасць музычна ўзбагаціць спектакль, пазбегнуць традыцыйнага суправаджэння на баяне.

Адным з найбольш эфектыўных сродкаў развіцця лялечнай самадзейнасці, росту калектываў з'явіўся б выпуск камплектаў гатовых лялек або (гэта больш рэально) — загатовак для вырабу лялек па прынцыпу дзіцячых канструктараў. Напрыклад, фабрыка драўляных цацак выпускае галоўкі-шарыкі на палачках, да якіх прымацаваны драўляныя ручкі. Дзеці самі прымацуюць патрэбнай формы нос, зробяць вочы, намалююць рот, прымацуюць да рук дроцікі, пашыюць касцюмы. Падобныя загатоўкі могуць быць зроблены з гумы, тканіны, ваты і г. д. Большасць жа лялек, якімі карыстаюцца гурткоўцы, гэта гатовыя лялькі, што выпускаюць майстэрні Усесаюзнага тэатральнага аб'яднання. Часта нараджэнне новага гуртка якраз і звязана з атрыманнем такога камплекта. Атрымалі камплект — закіпела работа. Паставілі ўсе казкі, на якія разлічаны камплект, сцёрліся і згубіліся лялькі — і гурток распадаецца...

Камплекты гатовых лялек альбо загатоўкі іх вельмі нам неабходны. Тэатры ж могуць быць не толькі ў школах, палацах піянераў і дзіцячых садах, але і ў сем'ях. Тыя, хто захочуць зрабіць свае, больш цікавыя лялькі, — хутчэй разбяруцца ў тэхніцы іх вырабу, калі пазнаёмяцца з гатовымі мадэлямі.

У Чэхаславакіі — краіне, дзе асабліва папулярны лялькі, — у кожнай педагагічнай навучальнай установе абавязкова вывучаюцца асновы лялечнага мастацтва. У краіне тысячы самадзейных лялечных калектываў. Штогод праводзяцца фестывалі лялечнікаў-аматараў. На фестывалях не толькі праглядаюцца лепшыя спектаклі, але і праводзяцца невялікія канферэнцыі. Узровень спектакляў вельмі высокі. Выяўленчае рашэнне некаторых пастановак аказваецца нават больш цікавым і арыгінальным, чым у прафесіянальных тэатрах.

Відаць, і наш наступны агляд трэба спалучыць з канферэнцыяй, прысвяціўшы яе адной якой-небудзь важнай праблеме лялечнага мастацтва.

Сёлетні агляд прынёс шмат радасці. Мы пазнаёміліся з вялікай арміяй энтузіястаў, якія аддаюць любімай справе шмат сіл. Можна ўзрадавацца і за поспехі калектываў, што атрымалі дыпломы, і за тых, што пакуль не атрымалі іх, за сотні юных гледачоў, якія далучыліся да вялікага мастацтва тэатра.

Дзяды і прадзеды тых, хто ў дні агляду выступалі на сцэне Палаца культуры прафсаюзаў, таксама любілі лялькі. Старажытны беларускі лялечны тэатр батлейка быў мала падобны да цяперашняга. Але і тады ён рабіў вялікую справу, і тады ён быў надзённы, сацыяльна востры, займаў значнае месца ў духоўным жыцці народа. Мастацтва лялек, нібы эстафета, пераходзіць ад пакалення да пакалення. Лялькі па-ранейшаму патрэбны людзям.

ДАРОГА ДА ТАНЦА

Наш ансамбль штогод падарожнічае па гарадах СССР і краінах свету. Мы выступаем на самых разнастайных сцэнічных пляцоўках — у канцэртнай зале і на вялікім стадыёне, у сціплым памяшканні заводскага клуба і на гарадской плошчы, у Палацы спорту і на зялёным лужку.

Выкарыстоўваючы дасягненні харэаграфічнай і тэатральнай культуры свету, ансамбль у сваім выкананні імкнецца творча аднавіць народны танец, даць яму новае сцэнічнае жыццё. Таму мы прад'яўляем да выканаўцы вялікія патрабаванні. Ён павінен валодаць не толькі высокай віртуознай танцавальнай тэхнікай, але і акрабатыкай, і жангліраваннем, павінен быць музыкантам. Ён павінен у дасканаласці валодаць пластычнай гібкасцю, харэаграфічнай выразнасцю, майстэрствам пераўвасаблення, каб праўдзіва ствараць самыя разнастайныя жывыя чалавечыя вобразы, перадаваць у танцах іх нацыянальны характар, радасць працы, жыццё простых людзей.

Мы няспынна працягваем збіраць узоры народных танцаў, каб зрабіць іх здабыткам усіх людзей не толькі Савецкай краіны, але і за рубяжом. Пасля кожнай нашай гастрольнай паездкі (ансамбль пабываў амаль у сарака краінах свету), пасля сустрэч з гледачамі, мы заўсёды адчуваем, наколькі вялікая сіла мастацтва, як яно аб'ядноўвае людзей, як яно садзейнічае большаму іх узаемаразуменню.

У адыходзячым 1965 годзе вельмі цікава праходзіла наша работа. Апрача гастроляў па гарадах Савецкага Саюза, наш ансамбль з поспехам зрабіў турнэ па ЗША (дзе мы выступалі ў чацвёрты раз) і па Канадзе. За чатыры з паловай месяцы гастроляў мы ў 30 гарадах гэтых краін далі 111 канцэртаў. Знамянальна, што прэм'ера савецкага ансамбля «Дарога да танца» адбылася ў Манрэалі.

Нашы зарубежныя гастролі 1965 года завяршыліся паездкай у Алжырскую Рэспубліку. Тры тыдні савецкія танцоры ўпершыню выступалі ў гэтай краіне, маляўнічая прырода якой і асабліва яе ветлівы народ зрабілі на нас глыбокае ўражанне.

Якія нашы планы ў новым, 1966 годзе?

10 лютага, у дзень 29-й гадавіны існавання Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля танца СССР, мы пакажам у Маскве прэм'еру «Дарога да танца». Так будзе называцца першае аддзяленне нашай праграмы, у якой мы раскажам пра творчы шлях нашага ансамбля і яго майстроў. Мы раскрыем «сакрэты» сваёй лабараторыі і пакажам метады выхавання артыстаў савецкага балета. Другое аддзяленне праграмы мы назавём «Па краінах свету». Яно будзе прысвечана нашым уражанням аб танцавальным фальклоры народаў многіх краін свету. Савецкім гледачам таксама будзе цікава паглядзець творча асэнсаваныя ансамблем танцы народаў Італіі, Іспаніі, Аргенціны, Мексікі і іншых краін зямнога шара.

У бліжэйшы час будзе ўдакладнен план гастроляў ансамбля ў новым годзе. Магу пакуль сказаць, што восенню 1966 года мы паедзем на гастролі ў Францыю. Гэта будзе трэцяя наша паездка ў краіну. І, безумоўна, як бы ні быў запоўнены маршрут нашых зарубежных гастроляў, мы заўсёды знойдзем час і магчымасць для паездак па гарадах нашай краіны, каб яшчэ раз выступіць перад савецкімі гледачамі.

Ігар МАІСЕЕЎ,
народны артыст СССР,
мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля народнага танца СССР.
(АДН)

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ *За рубяжом*

ДРУГОЕ НАРАДЖЭННЕ БІЛІ БОРКЕРА

У кожнага народа ёсць любімыя літаратурныя героі, якія, сышоўшы з кніжных старонак, пачынаюць другое жыццё. У кругу сяброў, за чашкай чаю або за кубкам піва, на паляўнічым прывале або на рыбалцы хто-небудзь ды і пачне: «Аналагічны выпадак быў і з бравым салдатам Швейкам... Вось паслухайце!» Або: «Памятаеце, Васіль Цёркін сказаў...» Не забудуць і дзеда Шчукара, і Хаджу Насрэдзіна і Ціля Уленшпігеля...

А вось і Білі Боркер. Вы, магчыма, і не ведаеце яго? Што ж, аўстралійскі пісьменнік Фрэнк Хардзі будзе рад пазнаёміць вас з ім. Нядаўна выйшла з друку яго новая кніга «Расказы Білі Боркера».

Кніга новая. Першае выданне. А героя ведае і любіць уся Аўстралія. Ведае іменна дзякуючы Фрэнку Хардзі. Яшчэ да з'яўлення кнігі вясёлы расказчык Білі Боркер, у таленавітым выкананні артыста Пітэра Кервера, стаў любімцам тэлегледачоў. Яго расказы ў піўнушках (не забывайце, гата — Аўстралія, дзе докеры, мараки, металісты гадзінамі бавяць свой вольны час за куфлям піва) пра ўсялякую ўсячыну, што здараецца і з партовымі грузчыкамі, і з вандроўнымі гандлярамі, і з вадзіцелямі таксі, ужо даўно перадаюцца з вуснаў у вусны.

З'яўленне гэтых расказаў у сабраным выглядзе — каштоўны падарунак аўстралійцам. Фрэнк Хардзі выявіў сябе бліскучым майстрам народнай мовы. Яго герой — Білі Боркер — гэта аўстраліец (а не англічанін, не шатландзец, не амерыканец, хоць усе яны гавораць на англійскай мове) са сваёй характэрнай мовай і душэўным складам.

Білі Боркер пачаў другое жыццё.

В. ХМАРА,
карэспандэнт ТАСС.

ПАД ПАГРОЗАЙ РАЗБУРЭННЯ

У Вене адбыўся сімпозіум, прысвечаны пытанням уліку, аховы і рэстаўрацыі гістарычных помнікаў. Як паведаміла газета «Фольксштыме», на сімпозіуме адзначалася, што на захаванні скульптурных і архітэктурных збудаванняў краіны пагібельна адбіваюцца не толькі вынікі другой сусветнай вайны, але і разыцё новых тэндэнцый у сучаснай архітэктуры. Закон 1923 года аб зберажэнні і нявывазе за мяжу твораў выяўленчага мастацтва і архітэктуры патрабуе сур'ёзных дапаўненняў і паправак.

У сучасны момант у Аўстрыі налічваецца каля 2000 палацаў і замкаў, якія маюць гістарычную і мастацкую каштоўнасць і якім пагражае разбурэнне. Асабліва ў безнадзейным стане знаходзяцца архітэктурныя ансамблі, якія выкарыстоўваюцца ці не па прызначэнню, ці наогул забыты. «Фольксштыме» звяртаецца да аўстрыйскай грамадскасці з заклікам узняць голас у абарону гістарычных помнікаў і патрабаваць ад урада павелічэння асігнаванняў на іх рэстаўрацыю, ахову і ўтрыманне.

І. МАСЛАЎ.
(ТАСС).

Кутох калекцыянера

З ЧАСОЎ ІВАНА ГРОЗНАГА

Ціхі тупічок Лясного завулка старажытнага чувашскага горада Алатыра. Пад густой лістотай дом нумар 13.

Тут жыве Рыгор Скрабін—пенсіянер, у мінулым выкладчык матэматыкі. Ён заўзяты збіральнік рэдкіх выданняў. Некаторым яго кнігам 300—400 гадоў.

— Я збіраю кнігі больш як сорак гадоў,— расказвае Рыгор Фёдаравіч.—Сёння ў маёй бібліятэцы больш чатырох тысяч тамоў.

Гаспадар паказвае свае скарбы. На стол кладуцца тоўстыя фаліянты, абкладзеныя драўлянымі дошчачкамі і абклееныя цёмна-карычневай скурай. Гэта «Сінопсіс» — летапісны звод выдання 1680 года, «Атлас Расійскай імперыі», выдадзены «во граде Святого Петра» ў 1792 годзе, «Духоўны рагламент» часоў Пятра I. Побач—«Раскольнікі і астрожнікі» Ліванава (1872) г., кніга «Руская і Напалеон Банапартэ (з далучэннем многіх цікавых анекдотаў і плана Масквы), пісаная маскоўскім жыхаром у 1813 годзе», «Першабытны Брусаў каляндар», надрукаваны ў 1875 годзе ў Харкаве. Вельмі каштоўнымі з'яўляюцца старажытнейшыя бібліі, псалтыры, выдадзеныя ў 1664—1692 гадах, і рукапісныя кнігі 1551 года—часоў Івана Грознага.

Гісторыя пошукаў кожнага з тамоў—захапляльны расказ аб рабоце калекцыянера.

У алатырскага калекцыянера ёсць камплекты часопісаў «Нива», «Пробуждение», «Родина», «Вокруг света», якія даўно сталі рэдкасцю.

Пётр СЫМКІН.
(АДН)

На той бок

Лёс карціны Гоі

Нарэшце разгадана чатырохгадовая тайна знішчэння Гоі. У Лондане толькі што закончыўся судовы працэс па «справе аб крадзяжы з Нацыянальнай галерэі карціны Гоі «Партрэт герцага Велінгтонскага». Твор славутага іспанскага мастака пры зусім таямнічых абалічэннях знік з галерэі яшчэ ў 1961 годзе. Першы час пра яго не было нічога чуваць і пачалі ўжо выказвацца апасенні, што ён вывезен з Англіі. Потым раптам тэлеграфныя агенцтвы і газеты пачалі атрымліваць ананімныя пісьмы з дзіўнай прапановай: вярнуць карціну пры ўмове, што папярэдне яна будзе выстаўлена для платнага агляду.

І раптам сёлета злодзей аб'явіўся. Ім аказаўся пажылы беспрацоўны Кемптан Бантан, які паведаміў, што карціна знаходзіцца ў багажным аддзяленні вакзала ў Бірмінгеме. Агенты Скотленд-ярда, якія паспяшаліся ва ўказанае месца, сапраўды знайшлі там «Герцага Велінгтонскага» ў цэласці і захаванасці.

У Лонданскім судзе Олд Бейлі сталі, нарэшце, вядомыя прычыны крадзяжу. Кемптан Бантан, які сам знаходзіўся ў цяжкім фінансавым становішчы, вырашыў весці кампанію збору сродкаў для састарэлых пенсіянераў, выбраўшы для гэтага трошкі незвычайны спосаб. Ён збіраўся ўнесці грошы, вырученыя ад выстаўкі карціны, у фонд дапамогі пенсіянерам, якія не могуць плаціць падатак за карыстанне тэлевізарам. Гэтая ідэя, расказаў ён, паявілася ў мяне яшчэ ў 1959 годзе, калі адна старэнькая снарэдзілася мне, што не можа дазволіць сабе мець тэлевізар. Дарэчы, сам Бантан двойчы сядзеў у турме за адмаўленне плаціць падатак. Беручы пад увагу той факт, што абвінавачваемы не праследаваў мэты асабістага ўзбагачэння, суддзі вынеслі яму параўнаўча мяккі па англійскіх законах прыгавор—тры месяцы турэмнага зняволення.

Такім чынам, да ўсеагульнага здавальнення, карціна Гоі зноў заняла сваё месца ў Нацыянальнай галерэі. Трохі нямногі адчувае сябе толькі паліцыя, заслугі якой у вяртанні карціны звяліся да нуля. Праўда, за гэты час Скотленд-ярд прарабіў вялікую работу, шукаючы Гою: былі праінтэрв'юіраваны сотні людзей, абшукаліся цягнікі і самалёты, была ўстаноўлена сувязь з паліцыяй іншых краін. Усё без вынікаў. Зрэшты, цяжкае становішча англійскіх шпікаў можна зразумець, бо за чатыры гады Бантан не абмовіўся ніводным словам пра карціну нават сваёй жонцы.

В. ЧУКСЕЕЎ.
карэспандэнт ТАСС.
Лондан.

ЭКСПАНАТЫ—ГАРМАТНЫЯ СТВАЛЫ

Днямі з Масквы ў Дзяржаўны музей БССР быў дастаўлены не зусім звычайны па сваіх памерах груз — дзве трафейныя гарматы перыяду Айчыннай вайны 1812 г. Экспанаты пераданы Беларусі дырэкцыяй музеяў Маскоўскага Крамля.

Абедзве гарматы бронзавыя. Адна адліта ў 1798 г., а другая ў 1802 г. у Вене (Аўстрыя).

Цікавая гісторыя гэтых ствалоў. У час Айчыннай вайны 1812 г. па ўказу Галоўнакамандуючага рускай арміі М. І. Кутузава спецыяльныя каманды збіралі ўсе трафейныя гарматы і звозілі іх у Маскоўскі Крэмль. Такім чынам было сабрана 875 французскіх, аўстрыйскіх, галандскіх, баварскіх, саксонскіх, прусскіх, вюртэнбергскіх, неапалітанскіх гармат. Меркавалася стварыць з трафеяў манумент у гонар перамогі над арміяй Напалеона. Архітэктары зрабілі некалькі праектаў манумента. У адным з іх прадугледжвалася пераплаўка трафейных гармат і адліўка бронзавай калоны з арлом.

Быў праект манумента са ствалоў гармат у выглядзе вінтавой лесвіцы. Але па невядомых прычынах ні адзін з праектаў не быў зацверджан царскім урадам.

Гарматы непрыяцеля звозіліся з тэрыторыі, на якой адбываліся кровапралітныя баі з французскімі захопнікамі.

Р. САМСОНАЎ.

...ЛЬТАРМЕЕЦ— ...АВЕК БАГАТЫХ ВЕДАЎ

...не. Пачатак на 1-й стар.].

...каны ў плане інстытута рад ...заў па павышэнню кваліфі... ...чыкаў музычных школ, ра... ...яў, паркаў культуры і ад...

...тал на правах рукапісу ін... ...е выдаваць бюлетэнь лепша... ...Першы нумар выйдзе ў сту... ...66 года. Бюлетэнь рэдагуе кале... ...ладзе 12 чалавек.

...тут прымае актыўны ўдзел у ...ені раённых семінараў культас... ...ноў, памагае абсталёўваць метадычныя кабінеты раённых дамоў культуры.

Спачатку нам здавалася, што мерапрыемствы інстытута вельмі цяжкія, што нам і работнікам на месцах вялёгка будзе іх выканаць. Але першыя месяцы работы паказалі, што ўсё не так ужо складана, калі працаваць не ў адзіночку. Усе мерапрыемствы мы праводзім разам з абласным саветам прафсаюзаў, таварыствам «Веды», абкомам камсамола. Нам памагаюць партыйныя органы. Уважліва ставяцца да нашых просьбаў Рэспубліканскі метадычны кабінет, рэспубліканскі Дом народнай творчасці, прысылаючы сваіх работнікаў для ўдзелу ў рабоце курсаў, семінараў.

Нашу ініцыятыву падтрымаў аблвыканком, на арганізацыю курсаў выдзелены спецыяльныя сродкі. Слухачы месячных курсаў атрымліваюць стыпендыю, аплочваецца праезд і кватэрныя (сутачныя, праезд і кватэрныя на ўсіх семінарах выплачваюцца сельскім культасветработнікам).

Першыя водгукі слухачоў аб рабоце семінараў і курсаў радуюць і натхняюць нас. Яны гавораць, што мы пачалі патрэбную справу. Вядома, ёсць цяжкасці, ёсць шмат нявырашаных пытанняў. Хацелася б, каб у рэспубліканскім Доме народнай творчасці або ва Упраўленні культасветустаноў нашага міністэрства быў работнік, які б спецыяльна займаўся пытаннямі вучобы кадраў культасветустаноў. Бо нялёгка арганізаваць амаль на працягу года вучобу такога вялікага калектыву людзей.

Арганізоўваючы вучобу ў інстытуце, мы не забываем пра галоўнае: работнікі, якія не маюць спецыяльнай адукацыі, павінны вучыцца на завочных аддзяленнях спецыяльных навучальных устаноў. Сёння ў вобласці 256 завочнікаў. Стараемся памагаць ім. Упэўнены, што колькасць завочнікаў на наступны год значна павялічыцца.

Спадзяёмся, што работа нашага інстытута, які працуе на грамадскіх асновах, паможа ажывіць, зрабіць цікавейшай работу палацаў культуры і клубаў, якія будуюцца клапатлівымі рукамі працаўнікоў вёскі.

Больш двух мільёнаў розных шкляных цацак для навагодніх ёлак выпусцілі рабочыя шкладуўнага цэха Мінскай фабрыкі мастацка-галантарэйных вырабаў. Над размалёўкай іх многа папрацавалі Д. Сердзюкова, Я. Кіовіч, М. Зароўская і Р. Дзянісава, якіх вы бачыце на здымку, зробленым нашым пазаштатным фотакарэспандэнтам А. Усцінавым.

ДЗВЕ КНІГІ — У ЗАПАЛКАВЫМ КАРАБКУ

Памер вокладкі гэтай кніжкі-малюткі — 28 на 23 міліметраў, таўшчыня — 12 міліметраў. У ёй 300 старонак тонкай, але шчыльнай і трывалай паперы. На кожнай старонцы 12 радкоў прыгожай арабскай вязі, акаймаваных віньеткай паводле матываў арабскага нацыянальнага арнаменту. Гэта текст свяшчэннай кнігі мусульман — «Карана». Пераплёт цікавага выдання, якое вызначаецца высокай паліграфічнай тэхнікай, выкананы з тонкай, ціснёнай золатам скуры. Дзве такія кніжачкі лёгка могуць змясціцца ў запалкавым карабку.

Мініяцюрны «Каран» захоўваецца ў хатняй бібліятэцы мыхара цалінага пасёлка Дзяржавінні ў Казахстане Івана Гаршкова. Да яго кніга трапіла выпадкова. Дзесяцігадовая дачка знайшла яе на адной з вуліц Ташкента, дзе тады жылі Гаршковы.

На жаль, «Каран» не мае дадзеных аб месцы і часе выдання. Але, мяркуючы па стылі і манеры афармлення, можна думаць, што зроблена кніга ў канцы мінулага або пачатку нашага стагоддзя ў адной з краін Арабскага Усходу.

АДН.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

28 снежня

Першая праграма. 11.00 — «Кар'ера Дзімы Горына». Мастацкі фільм. 16.55 — праграма перадач. 17.00—для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «У снежнай дзяржаве». Перадача з Ленінграда. 17.30 — «Бібліятэка навелы». 18.10 — эканамісты за «круглым сталом» (М). 18.50 — тэлевізійныя навіны. 19.05 — «Хто ўпрыгожыў ёлку?» Кінанарыс. 19.15 — «Свет у 1965 годзе». Міжнародны агляд (М). 20.15 — А. І Б. Стругацкія. «Панядзелак пачынаецца ў суботу». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Ленінграда. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «Тэатральныя сустрачы». У гасцях у Леаніда Уцёсава. Перадача з Цэнтральнага Дома акцёра імя А. А. Яблачкінай (М).

Другая праграма. 17.30 — «Сельская навіна» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «У нас у гасцях — Беларуская дзяржаўная кансерваторыя». Перадача-канцэрт. 19.25 — па роднай краіне. «Да вытокаў жывой вады», «Горы і людзі». «Па трасе кругасветнага падарожжа». Кінанарысы. 20.15 — насустрач 50-годдзю Савецкай улады. «Апошняя ноч». Мастацкі фільм.

29 снежня

Першая праграма. 11.00 — «Бібліятэка навелы». 11.35 — «Дзесяць дзён, якія ўзрушылі свет». Тэлевізійны спектакль. 16.40—праграма перадач. 16.45 — для школьнікаў «Святочны канцэрт» (М). 17.30 — тэлевізійныя навіны. 17.50 — школьная фільматэка. «Фама Гардзееў». Мастацкі фільм. 19.35 — рашэнні вераснёўскага Пленума ЦК КПСС — у жыццё. «У новых міністэрствах». Інтэр'ю міністра лёгкай прамысловасці А. Ф. Нічыпар. Дэманстрацыя навінак 1966 года. 20.35 — «Пра нагаводняя ёлкі». 20.50 — «Шчыра кажучы». Тэлевізійная маладзёжная прэс-канферэнцыя. 21.50—канцэрт народнага артыста СССР Б. Гмыры. 22.30 — у эфіры — «Маладосць». «Казка старога года». Музычнае рэвю (М).

Другая праграма. 17.30 — «Навагодняя пасылка». Тэлефільм (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «Час і людзі». Тэлевізійны летапіс (М). 19.00—балет К. Данькевіча «Лілея». Спектакль Кіеўскага тэатра оперы і балета імя Т. Р. Шаўчанкі. Перадача з Кіева. У перапынках — тэлевізійныя навіны.

30 снежня

Першая праграма. 16.25 — праграма перадач. 16.30 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Я. Шварц. «Два браты». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля (М). 17.15 — «Здароўе». «Медыцына ў 1965 годзе». 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20—фільматэка. «Як зляцілі самагу». Кароткаметражны фільм. 18.40 — «Майстры мастацтваў». Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Ул. Ул. Кумельсні. 19.05 — «Добры дзень, 1966 год!» Тэлевізійны рабочы клуб. Уключанне Віцебска, Брэста. Святочны выпуск. 20.25 — насустрач 50-годдзю Савецкай улады. «Дзесяць дзён, якія ўзрушылі свет». Тэлевізійны спектакль. 21.30 — «Эстафета навін». Святочны выпуск (М).

Другая праграма. 12.00 — для дзяцей. «Злоўленая вясёлка». Тэлевізійны фільм (М). 12.35 — «Капітан Тэнкеш». Тэлевізійны мастацкі фільм. Першая частка (М). 18.00—тэлевізійныя навіны (М). 18.30 — лепшыя фільмы савецкага кіно. «Сябар мой. Колька». Мастацкі фільм (М). 20.00 — «Музычныя прэм'еры года» (М).

31 снежня

Першая праграма. 11.00 — у дні школьных канікул. «Хаціна дзядзі Тома». Тэлевізійны фільм. 16.25 — праграма перадач. 16.30 — для дзяцей. «Чараўніца з Галоўчуда». Прэм'ера спектакля Беларускага тэлебачання. 17.10 — для школьнікаў. Опера М. Равеля «Дзіця і чараўніцтва». Перадача з Ленінграда. 18.00 — «Зай і Чык». «Мішка плюс Машка». «Калі запальваюцца ёлкі». Зборнік мультыплікацыйных фільмаў. 18.40 — тэлевізійныя навіны. 19.10 — «Запаліліся агні навагодняя». Музычная перадача. 20.10 — «Пра тых, каго не будзе за святочным сталом». (Пра людзей, якія абслугоўваюць нас у будні і свята). 20.20 — «Трактарысты». Кінакамедыя. Вытворчасць кінастудыі «Масфільм». 21.50 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «На агеньчык». «Навагодні каляндар» (М). 23.50 — «З новым годам, таварышы!» (М). 00.05 — «На агеньчык». «У першую гадзіну» (М).

Другая праграма. 12.00 — для дзяцей. «Новы плашч Бураціна». Тэлевізійны фільм (М). 12.30 — «Капітан Тэнкеш». Тэлевізійны мастацкі фільм. Другая частка (М). 15.45 — для школьнікаў. «Вострыў Калдун». Мастацкі фільм (М). 16.50 — тэлевізійныя навіны (М). 17.10 — «Чароўны туфлік». Музычны тэлефільм. 18.00 — «Першыя сустрэчы». Цыркавое прадстаўленне (М). 19.10 — тэлевізійныя навіны (М). 19.20 — «Калі песня не заканчваецца». Мастацкі фільм (М). 20.50—«Нечаканыя павароты». Амаль агляд (М). 21.50—тэлевізійныя навіны (М).

Наступны нумар газеты выйдзе 1 студзеня 1966 г.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГОРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

МІЖГАРОДНІЯ ТЭЛЕФОННЫЯ РАЗМОВЫ

У РАБОЧЫЯ ДНІ ТЫДНЯ З 0.00 ДА 7 ГАДЗІН І З 18 ДА 24 ГАДЗІН, А У ПЕРАДСВЯТОЧНЫЯ І ПЕРАДВЫХАДНЫЯ ДНІ З 0.00 ДА 7 ГАДЗІН І З 16 ДА 24 ГАДЗІН КАШТУЮЦЬ НА 25 ПРАЦЭНТАЎ ДЗЕШАВЕЙ, ЧЫМ ЗВЫЧАЙНА.

МІЖГАРОДНІЯ ТЭЛЕФОННЫЯ СТАНЦЫІ РЭСПУБЛІКІ НАЛАДЖВАЮЦЬ ПЕРАГАВОРЫ З ЛЮБЫМ ПУНКТАМ САВЕЦКАГА САЮЗА:

— з кватэрнага тэлефона—у крэдыт;
— з перагаворнага пункта—зэ наўны разлік;
— з любога тэлефона (у арганізацыі або ўстанове, у праўленні калгаса, саўгаса, на ферме або ў кватэры) — па загадзя купленаму талону ў аддзяленні сувязі ці перагаворным пункце.

КАРЫСТАЙЦЕСЯ МІЖГАРОДНЯЯ ТЭЛЕФОННАЯ СУВЯЗЗЮ!

Міністэрства сувязі БССР.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнтнага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Завіда».
Індэкс 63856. АТ 03603